

Што пачым на рынках?

СТАР. 3



Асноўныя ворагі сексуальнасці

СТАР. 7



Адказнасць за наркотыкі будзе расці

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 САКАВІКА 2014 г. СЕРАДА № 45 (27655) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# З УЛІКАКАМ СУЧАСНЫХ РЭАЛІЙ

**Аляксандр Лукашэнка правёў учора нараду па ўдасканаленні сістэмы і работы па прыёме ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Фота БЕЛТА.



Як праінфармавалі ў прэс-службе, новая рэдакцыя правілаў прыёму не прадугледжвае якіх-небудзь карэнных змен у сфарміраванай і ў цэлым зладжанай сістэме арганізацыі прыёму ў ВНУ і ССНУ, у якой у якасці асноўнай формы арганізацыі ўступных іспытаў выкарыстоўваецца ЦТ.

Новая рэдакцыя нацэлена ў першую чаргу на вырашэнне праблем набору абітурыентаў на вострадэфіцытныя спецыяльнасці ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія ўзніклі ў апошнія гады пад уплывам дэмаграфічных і некаторых іншых фактараў, спрашчэнне працэдуры вырашэння шэрагу арганізацыйных і тэхнічных пытанняў правядзення ўступнай кампаніі, якія не паўплываюць на зніжэнне ўзроўню яе аб'ектыўнасці і празрыстасці, а таксама рэалізацыю прапаноў дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у 2013 годзе.

## ПАТРЭБНА РАННЯЯ ПРАФЕСІЙНАЯ АРЫЕНТАЦЫЯ

Ва ўступным слове Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сумным вынікам прыёмнай кампаніі мінулага года сталі сотні незапоўненых бюджэтных месцаў. «Мы павінны дакладна разабрацца, чаму так здарылася. Можа быць, кадры, якія рыхтуюць у ВНУ, не запатрабаваныя? Жыццё сведчыць, што гэта не так. Значыць, галоўная прычына ў нізкай папулярнасці некаторых спецыяльнасцяў у моладзі», — лічыць беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка прывёў меркаванне шэрагу экспертаў аб тым, што эфектыўным сродкам прыцягнення абітурыентаў магла б стаць ранняя прафесійная арыентацыя. Гэтыя эксперты, у прыватнасці, прапануюць разгледзець магчымасць ўкаранення профільнага навучання, а таксама адкрыцця спецыялізаваных класаў і школ з ухілам.

«Я пра гэта сказаў, але я не разумею, якая больш ранняя прафарыентацыя і якія класы з ухілам патрэбны для таго, каб агітаваць і прыцягнуць вучняў школ да паступлення ў педагагічныя ВНУ. Якая тут яшчэ патрэбна прафарыентацыя, калі самі школы з першага па апошні клас выконваюць гэтую функцыю. Яны (дзеці — **заўвага БЕЛТА**) бачаць з 6-7 гадоў тое, чым трэба будзе займацца цяперашняму вучню, а заўтра настаўніку. Але, тым не менш, настаўнікаў у нас не хапае», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, сістэма ранняй прафарыентацыі прапануецца без якога-небудзь аналізу таго, які ад гэтага будзе вынік.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў сучасных выпускнікоў школ змяніліся матывы, якія ўплываюць на выбар імі жыццёвага шляху. «Раней, напрыклад, для выпускніка быў важны і прэстыжны сам факт паступлення ў ВНУ. А цяпер прагматычная моладзь імкнецца выбіраць спецыяльнасці, якія ў будучым дадуць добры заробак. Акрамя вучобы, у яе з'явіліся і іншыя прывабныя варыянты жыццеўладкавання — напрыклад, прадпрымальніцтва», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым заўважыў, што многія, скончыўшы ВНУ, лічаць сябе гатовымі бізнесменамі або адразу разлічваюць на высокі заробак. «Нават калі не бізнесмен, то лічыць, што ў яго павінны быць набіты «зялёнай капустай» кішэні і яшчэ недзе існаваць рахункі — не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі, — адзначыў Прэзідэнт. — Далёка не кожны малады чалавек можа быць паспяховым прадпрымальнікам і бізнесменам. Гэта вельмі цяжкая праца».

На думку Аляксандра Лукашэнкі, тое, што маладыя людзі, скончыўшы ВНУ, ужо бачаць сябе буйнымі бізнесменамі, нейкімі Ракфелерамі сучаснасці, у некаторай ступені дрэнна». Ускоквае ў гэтую нішу, а потым аказваецца, што ён нікуды не варты прадпрымальнік. І атрымліваецца, што моладзь, сутыкнуўшыся з гэтым, пачынае скардзіцца і крыўдзіцца, што ўлада не стварыла, бачыце, нейкіх умоў і ў нас у краіне ўсё дрэнна», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. «Таму моладзі трэба ўбіць у галаву, што мы не супраць прадпрымальніцтва — гэта добра. Але паспяховае прадпрымальніцтва і бізнес — найцяжэйшая праца, і не кожнаму гэта дадзена», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## НЕ ДАПУСКАЦЬ ПРАЯЎ КАРУПЦЫІ

Прэзідэнт заклікаў чыноўнікаў і кіраўнікоў арганізацый зрабіць высновы з падзей ва Украіне і не дапускаць праяў карупцыі. «Не дай Бог, мы ў вашых ВНУ выявім нейкую там карупцыю. Толькі ідыёт пасля падзей ва Украіне не зробіць адпаведных высноў», — падкрэсліў Прэзідэнт, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады. «У аснове развалу краіны, які адбыўся ў суседняй дзяржаве, ляжыць развал эканомікі і страшная карупцыя. Вось дзве прычыны, якія разбурылі дзяржаву», — падкрэсліў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што якім бы ні быў стан эканомікі ў дзяржаве, менавіта карупцыя з'яўляецца той іржой, якая будзе раз'ядаць усё.

## ГАЛОЎНАЕ — ЖАДАННЕ І ЗДОЛЬНАСЦЬ ПРАЦАВАЦЬ

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што галоўнае значэнне мае нават не высокі ўзровень ведаў у момант паступлення, а жаданне і здольнасць працаваць, дабівацца выніку ў працэсе вучобы. «Ці патрэбны падбор, мэтавыя накіраванні. Бо лёгка вызначыць будучага педагога, будучага ваеннага, які б ганарыўся тым, што ён носіць пагоны, што ён будзе абараняць Радзіму, — лічыць Прэзідэнт. — Мы хочам канкрэтную працу падмяніць нейкай прафарыентацыяй, балбатнёй. А на самой справе нічога гэтага не будзе. Усё як было, так і застанецца».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў падпарадкаванні многіх міністэрстваў ёсць свае профільныя ўстановы вышэйшай адукацыі, якія ў свой час было вырашана пакінуць менавіта ў гэтых ведамствах, а не перадаваць Міністэрству адукацыі. «Але вы і адкажаце за напаўненне гэтых ВНУ. Вось галоўная ваша задача», — падкрэсліў беларускі лідар, звяртаючыся да прысутных міністраў. Прэзідэнт запатрабаваў у пытанні мэтавага набору займацца канкрэтнай справай: «Дамовіліся з бацькамі, з дзяўчынай або хлопцам: хочаш быць настаўнікам — вось табе мэтавае накіраванне, ты павінен здаць экзамен. Я не кажу — атрымаць там найвышэйшы бал».

СТАР. 2

# БАЧЫЦЬ НАСКРОЗЬ

Фота БЕЛТА.



**Навукоўцы Інстытута фізікі імя Б.І. Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук распрацавалі лазерна-аптычны тэрагерцавы спектрометр, які можна выкарыстоўваць у медыцыне, вытворчасці і сістэмах бяспекі. Гэты прыбор з'яўляецца для Беларусі ўнікальным. Яго выпраменьванне, у адрозненне ад рэнтгенаўскага, аптычнага і выпраменьвання ЗВЧ-дыяпазону, здольнае пранікаць скрозь вопратку, паперу, кардон, пластмасы (напрыклад, можна ўбачыць унутраную паласць зуба) — практычна праз усе рэчывы, акрамя металу. А галоўнае, на думку спецыялістаў, — гэта тое, што тэрагерцавае выпраменьванне бясшкоднае, у адрозненне ад рэнтгенаўскага.**

**На здымку:** загадчык лабараторыі сістэм пераўтварэння светлавых палёў Інстытута фізікі імя Б.І.Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Георгій СІНІЦЫН дэманструе «бясшкодны рэнтген».

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

***«На аздараўленне школьнікаў у перыяд вясновых канікул выдзелена амаль Br10 млрд са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. У лагерах з дзённым знаходжаннем атрымаюць магчымасць адпачыць і ўмацаваць здароўе на працягу не менш за шэсць дзён 61 тыс. 650 школьнікаў. Фінансаванне на гэтыя мэты выдзелена з разліку 26 тыс. 565 рублёў на адзін ложка-дзень, як і падчас зімовых канікулаў. У лагерах для хлопчыкаў і дзяўчынак традыцыйна арганізуюцца аздараўленчыя, культурныя, спартыўныя мерапрыемствы».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.03.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9800,00 | ■ |
| Еўра | 13580,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 269,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 1077,52 | ▲ |

■ Без бар'ераў

# ЛЮДЗІ СПЯШАЮЦЦА, БЯГУЦЬ І НЕ АДКАЗВАЮЦЬ...

## Сляпая дзяўчына распавядае, як мы выглядаем, калі нас толькі чуюць і адчуваюць сэрцам

**У яе шыкоўнае прозвішча — Кацярына Раскошная. Ёй 30 гадоў. Яна не баіцца ездзіць па Мінску адна... «Што тут дзіўнага?» — спытаеце вы. Тое, што Кацярына нарадзілася сляпой.**



### «Я НАВУЧЫЛАСЯ НЕ ПАНІКАВАЦЬ У НЕЗНАЁМЫМ МЕСЦЫ»

Яна сустракае мяне на першым паверсе прадпрыемства, дзе працуе. У яе прамая пастава, прыемны голас, прыязная ўсмешка. Мы ідзём да яе кабінета. Кацярына трымаецца вельмі ўпэўнена, толькі каля самага ліфта сутыкаецца з хлопцам, які выходзіць адтуль. Ну што ж, і са мной такое бывае, калі задумаюся...

Напэўна, у кожнага з нас знойдуцца знаёмыя, якія губляюцца і панікуюць у незнаёмым месцы. Тут жа чалавек, пазбаўлены асноўнага канала ўспрымання — зроку. Як жа яна арыентуецца ў двухмільённым горадзе? Няўжо ёй не страшна?

СТАР. 5

■ Трэба ведаць

# У СТАЛІЦЫ ПАВЯЛІЧЫЛІ ФІКСАВАНЫЯ ПАДАТКІ ЗА ПРЫВАТНУЮ АРЭНДУ

**Стаўкі падатку за здачу жылля ў арэнду былі зменены адпаведным рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, якое апублікавана на Нацыянальным прававым партале.**



Адразу нагадаю, што фіксаваныя памеры падатковых ставак прымяняюцца, калі агульны даход прыватнага ўласніка ад здачы памяшканняў за год не перавысіў 37,835 млн рублёў.

Такія стаўкі для Мінска вызначаюцца ў залежнасці ад эканоміка-планіровачнай зоны здымнага жылля. Так, стаўка падатку на жылыя памяшканні (за кожны пакой), садовыя домікі і дачы ў першай эканоміка-планіровачнай зоне складзе 200 тысяч рублёў у месяц, у другой — 170 тысяч, у трэцяй і чацвёртай — 140 тысяч, у пятай — 120 тысяч рублёў. Заўважу, што раней за здачу жылля ў першай эканоміка-планіровачнай зоне кватэраздатчык штомесяц выплачваў у бюджэт 135 тысяч, у другой зоне — 110 тысяч, у трэцяй, чацвёртай і пятай зонах — 95 тысяч рублёў.

Павялічыліся падатковыя стаўкі і па арэндзе гаражоў. Цяпер за здачу металічных або драўляных гаражоў і машына-месцаў трэба будзе заплаціць ад 45 да 75 тысяч, а за здачу жалезабетонных або цагляных гаражоў — ад 75 да 90 тысяч рублёў у залежнасці ад эканоміка-планіровачнай зоны. Па іншых нежылых памяшканнях дзейнічае стаўка падатку ад 15 да 30 тысяч рублёў за 1 квадратны метр плошчы.

Спецыялісты прыватнага рынку арэнды ўпэўнены, што такое запланаванае і нязначнае павялічэнне фіксаванай падатковай стаўкі ўвогуле не паўплывае на агульную цэнавую тэндэнцыю гэтага сектара. Цэны на арэнду ў сталіцы і так «зашкальваюць».

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ПАРЛАМЕНТ КРЫМА ПРЫНЯЎ ДЭКЛАРАЦЫЮ АБ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ



За зацвярджэнне дэкларацыі прагаласавалі 78 дэпутатаў Вярхоўнага савета АРК з 81, што бралі ўдзел у галасаванні. Прыняцце дэкларацыі неабходна для правядзення рэферэндуму і наступнага магчымага ўваходжання Крыма ў склад Расіі. У выпадку, калі ў выніку прамога волевыяўлення народаў Крыма будзе прынята рашэнне аб уваходжанні Крыма, уключаючы Аўтаномную Рэспубліку Крым і горад Севастопаль, у склад Расіі, Крым пасля рэферэндуму будзе абвешчаны незалежнай і суверэннай дзяржавай з рэспубліканскай формай праўлення, адзначаецца ў дэкларацыі.

## ЯНУКОВІЧ ЗВЕРНЕЦЦА Ў КАНГРЭС І СЕНАТ ЗША

Тым часам адхілены ад улады прэзідэнт Віктар Януковіч заявіў аб намеры аспрэчыць у амерыканскім судзе рашэнне ЗША аб выдзяленні Украіне фінансавай дапамогі. Таксама ён плануе звярнуцца ў Кангрэс і Сенат ЗША з патрабаваннем зрабіць прававую ацэнку такога рашэння. Пра гэта ён заявіў у Растове-на-Доне журналістам. Паводле слоў Віктара Януковіча, рашэнне аб выдзяленні дапамогі Украіне супярэчыць амерыканскаму заканадаўству, паколькі ў ім змяшчаецца забарона на фінансаванне ўрада, які незаконна прыйшоў да ўлады. «Ніхто не мае права заахвочваць разбой і антыканстытуцыйныя перавароты», — сказаў ён. Януковіч таксама абвінаваціў краіны Захаду ў тым, што яны «аслеплі, страцілі памяць і забыліся, што такое фашызм». «Застаюся не толькі адзіным легітымным прэзідэнтам, але вярхоўным галоўнакамандуючым. Я жывы, мяне не адхілілі ад пасады, як гэта прадугледжана Канстытуцыяй», — заявіў Віктар Януковіч. Ён паабяцаў, як толькі дазволіць сітуацыя, абавязкова вярнуцца ў Кіеў.

## ЗША І НАТА НАКІРОЎВАЮЦЬ ДА МЕЖАЎ УКРАІНЫ САМАЛЁТЫ-РАЗВЕДЧЫКІ І ЗНІШЧАЛЬНІКІ



ЗША маюць намер у бліжэйшыя дні накіраваць у Польшчу больш амерыканскіх знішчальнікаў F-16. У паведамленні Пентагона адзначаецца, што гэта — «толькі адно з бачных дзеянняў, якія былі зроблены ЗША» ў сувязі з развіццём падзей вакол Украіны. Раней ЗША накіравалі дадаткова шэсць F-15C Eagle для ўзмацнення паветранай місіі ў краінах Балтыі. Акрамя таго, амерыканскі эсмінец USS Truxton быў накіраваны ў Чорнае мора. Самалёты-разведчыкі НАТА пачнуць патруляванне паветранай прасторы над Польшчай і Румыніяй, каб назіраць за сітуацыяй ва Украіне, перадаюць інфармагенцтвы. Прэс-сакратар НАТА паведаміў, што самалёты-разведчыкі будуць лятаць на мяжы з Украінай, аднак выключна над тэрыторыяй краін — членаў альянсу. Колькасць самалётаў, якія адправяцца на памежныя з Украінай тэрыторыі, не ўдакладняецца.

## МАСКВА І КІЕЎ ПРАВОДЗЯЦЬ ВАЕННЫЯ ВУЧЭННІ

Як вынікае з паведамленняў украінскіх СМІ, у напрамку да перакопскага перашыйка, які злучае Крымскі паўвостраў з «вялікай зямлёй», пачалі рухацца ўкраінскія войскі — у тым ліку БТР і танкі: узброеныя сілы Украіны праводзяць раптоўныя вучэнні ў Херсонскай вобласці. Падрабязнасцяў аб пазапланавых манеўрах няшмат. Так, па інфармацыі шэрагу мясцовых выданняў, для ўдзелу ў адпрацоўцы вучэбных задач задзейнічана ў тым ліку бронетэхніка з Львова: у выхадныя відавочцы назіралі, як калона БТР выязджае за межы горада, накіроўваючыся на паўднёвы ўсход. У Навацград-Валынскім Жытомірскай вобласці заўважылі падрыхтоўку да выезду на «нейкія вялікія вучэнні» 30-й асобнай механізаванай брыгады. Расійскія вайскоўцы паралельна з украінскімі пачалі новыя «раптоўныя» маштабныя вучэнні, на гэты раз — у паветрана-дэсантных войсках. «Дывізіённыя камандна-штабныя вучэнні з Іваноўскім злучэннем ПДВ стартавалі 11 сакавіка. Усяго ў вучэннях будзе задзейнічана каля 4000 дэсантнікаў, 36 паветраных суднаў ваенна-транспартнай і вайсковай авіяцыі», — паведаміў прадстаўнік прэс-службы Мінабароны. Падчас вучэнняў упершыню за больш чым 20 гадоў пройдзе масавая высадка дэсанту: у ёй прымуць удзел каля 3500 вайскоўцаў. Месцы правядзення дэсантнай аперацыі камандаванне злучэннем атрымае падчас вучэнняў. Кіруе манеўрамі камандуючы ПДВ генерал-палкоўнік Уладзімір Шаманаў, які мае вялікі вопыт баявых дзеянняў у Чачні.

■ Камунальныя стасункі

# У КВАТЭРАХ БУДЗЕ ЦЁПЛА

**Рашэнні пра адключэнне ацяплення прымаюцца на аснове доўгатэрміновага метэапрагнозу. Гэта значыць, што калі сёння цёпла, а заўтра пахаладае, батарэі ў кватэрах зноў стануць цяплейшымі і мерзнуць грамадзянам не давядзецца. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў начальнік аддзела энергетыкі і навукова-тэхнічнага развіцця Мінжылкамгаса Вячаслаў ШМІТ.**

У кожным доме ёсць цеплапункты, якія працуюць у адпаведнасці з тэмпературным графікам. Нават цяпер, пры рэкордна высокай для сакавіка тэмпературы,



радыятары ў іх застаюцца цёплымі, а падача цяпла на кацельных рэгулюецца аўтаматычна, у залежнасці ад таго, наколькі праграваецца паветра на вуліцы.

Але ў мэтах эканоміі пры добрым надвор'і падача цяпла спыняецца ў так званыя месцы агульнага карыстання — напрыклад, у радыятары на лесвічных маршах у пад'ездах. У той жа час батарэі ў кватэрах усё адно грэюць.

Канчаткова ж падача цяпла прыпыняецца, калі сярэднясутачная тэмпература паветра на працягу трох дзён трымаецца ад плюс 8 градусаў і вышэй. Гэту норму ўстанавілі летась: дагэтуль падставай для адключэння ацяплення з'яўлялася захаванне такой тэмпературнай нормы цягам пяці дзён.

Спачатку батарэі перастануць грэць у грамадскіх, адміністрацыйных будынках і прамысловых прадпрыемствах, пасля ацяпленне адключаць у жылых дамах, інтэрнатах, гасцініцах, і толькі потым цяпло перастане паступаць у дзіцячыя дашкольныя, школьныя, лячэбна-прафілактычныя, медыцынскія ўстановы, музеі, бібліятэкі, дзяржаўныя архівы і ўстановы сацыяльнага абслугоўвання.

Але, калі меркаваць па прагнозах сіноптыкаў, адбудзецца гэта яўна не ў бліжэйшыя дні.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на II квартал 2014 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 47 500 | 142 500 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 42 750 | 128 250 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 95 300 | 285 900 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 85 800 | 257 400 |

# З УЛІКАМ СУЧАСНЫХ РЭАЛІЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На думку кіраўніка дзяржавы, пэўную долю адказнасці павінна несці школа, дзе настаўнікі маюць магчымасць дасканала вызначыць здольнасці кожнага з вучняў. «І гэтую сістэму трэба стварыць, каб дырэктар з намеснікам дырэктара школы, падпісваючы накіраванне, разам адказвалі за гэтае дзіця. І каб яно, падпісаўшы дагавор, скончыўшы ВНУ, вярнулася туды, куды нам трэба. І я ўпэўнены, што мы там знойдзем вельмі шмат людзей і для ваенных, і для педагогаў, і гэтая праблема здымецца раз і назаўсёды», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, сістэма работы па прыёме ў ВНУ і ССНУ павінна ўлічваць сучасныя рэаліі. Ва ўмовах інавацыйнага развіцця эканомікі расце попыт на кваліфікаваных спецыялістаў. Там, дзе раней спраўляўся тэхнік або практык, сёння патрэбны інжынер. Таму ў Беларусі, як і ў іншых развітых краінах, адбываецца паступовы пераход да масавай вышэйшай адукацыі. «Якой гэта вышэйшая адукацыя павінна быць — тэма асобнай спецыяльнай гутаркі, але ў прыватнасцях мы ўжо вызначыліся. Мною даваліся даручэнні адпаведным службовым асобам аб тым, што мы павінны адаптаваць вышэйшую адукацыю і па тэрмінах, і па змесце да патрабаванняў сённяшняга дня», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што гаворка, у прыватнасці, ідзе аб неабходнасці пашырэння вытворчай практыкі падчас вучобы, каб, з аднаго боку, падрыхтаваць студэнтаў і навучэнцаў да будучай працы, а з другога — даць магчымасць ацаніць усе плюсы і мінусы абранай прафесіі. Гэта дазволіць маладым людзям раней зразумець, што яны, магчыма, зрабілі памылку ў выбары спецыяльнасці, і знайсці сабе прымяненне ў іншай сферы.

«Мы дамовіліся, што без рэвалюцый, наскокаў і абвалаў будзем удасканальваць сістэму вышэйшай адукацыі, падчысцім праграмы, прыбяром усё лішняе, што чалавеку не трэба будзе ў жыцці наогул. Паспрабуем пазбавіцца ад такіх настрояў, як здаў залік або экзамен. Ацэнку ў залікоўцы паставілі — і дзякуй богу. А назаўтра ўсё забыўся. Таму, улічваючы наш вопыт, мы павінны прывесці вышэйшую адукацыю ў адпаведнасць з патрабаваннямі сённяшняга дня», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Паводле слоў Прэзідэнта, вучыць абы-чаму, а тым больш непатрэбнаму, сотні тысяч маладых людзей, у нас, па меншай меры, для гэтага няма сродкаў.

Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што трымае гэтае пытанне на кантролі і даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта, а таксама старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатолю Рубінаву запланаваць з удзелам Прэзідэнта сур'ёзнае кантрольнае мерапрыемства на вышэйназваную тэму, дзе адказныя асобы здадуць справаздачу аб праведзенай рабоце.

Кіраўнік дзяржавы закрануў і праблемы прыцягнення абітурыентаў не толькі ў ВНУ, але таксама ў вучылішчы, каледжы і тэхнікумы, якія рыхтуюць кадры рабочых і спецыялістаў сярэдняга звяна. «Сёння трэба кропкава, прыцэльна змагацца за кожнага студэнта і навучэнца. Аднак мы не ўлічваем гэтыя абставіны пры арганізацыі ўступнай кампаніі. Напрыклад, у 2013 годзе з-за павышэння ніжняга парогавага значэння тэставага бала каля 36% усіх абітурыентаў не былі дапушчаны да конкурсу», — заўважыў Прэзідэнт. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, адным са сродкаў павышэння прывабнасці вострадэфіцытных спецыяльнасцяў магло б стаць увядзенне дадатковых прэферэнцый для маладых спецыялістаў. У сувязі з гэтым ён пацікавіўся, што могуць зрабіць у гэтым кірунку арганізацыі і мясцовыя ўлады.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка паставіў пытанне аб неабходнасці ў прынцыпе змены правілаў прыёму і іх якасці. «Калі прынцыпова нічога не мяняецца, ці трэба наогул прымаць новую рэдакцыю гэтых правілаў і бударажыць людзей? Ці забяспечаць яны якаснае паляпшэнне прыёмнай кампаніі?» — пацікавіўся Прэзідэнт.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І ГУРБАНГУЛЫ БЕРДЫМУХАМЕДАЎ АБМЕРКАВАЛІ АСПЕКТЫ ДВУХБАКОВАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедавым адбылася 11 сакавіка па ініцыятыве туркменскага боку. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі практычныя аспекты двухбаковага супрацоўніцтва. Было адзначана, што дасягнуты высокі ўзровень адносін дае магчымасць вырашаць стратэгічныя сумесныя задачы ў любой сферы ўзаемадзеяння. Прэзідэнты выказалі задавальненне вынікамі інтэнсіўнай сумеснай работы ў мінулым годзе і ўзросшым да $450 млн тавараабаротам. Аляксандр Лукашэнка і Гурбангулы Бердымухамедаў абмеркавалі шэраг сумесных праектаў у галіне паліўна-энергетычнага комплексу, паставак тэхнікі і іншых сферах. У ходзе размовы таксама было закранута пытанне аб будаўніцтве пасольства Туркменістана ў Мінску.

■ Мясцовыя выбары

# «У НАС ТАКОЕ САСТАРЭЛАЕ СТАЎЛЕННЕ: КАЛІ ВЫ НЕ ВЫРАШЫЦЕ НАШЫ ПЫТАННІ — МЫ НА ВЫБАРЫ НЕ ПОЙДЗЕМ»

**Ужо праз 11 дзён, 23 сакавіка, адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Аднак беларусы на першым этапе выбарчай кампаніі досыць пасіўныя. Большая частка тых, хто звяртаецца ў Цэнтральную выбарчую камісію, спрабуе вырашыць свае асабістыя пытанні. Пра гэта казала ўчора падчас анлайн-канферэнцыі на сайце Беларускага тэлеграфнага агенцтва старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.**


Фота БЕЛТА.

### ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ НЕ ЎМЕШВАЕЦЦА Ў РАБОТУ ДЗЯРЖОРГАНАЎ

— У нас такое састарэлае стаўленне: калі вы не вырашыце нашы пытанні — мы на выбары не пойдзем, — заўважыла кіраўнік ЦВК. — Тут я адразу магу сказаць: часы, калі кагосьці ўгаворвалі хадзіць на выбары, даўно ў мінулым. Удзел у выбарах з'яўляецца асабістым, нязменным правам кожнага грамадзяніна, і правам, якое не перадаецца. Ён можа ім скарыстацца або не скарыстацца, незалежна ад вырашэння пытанняў.

Лідзія Ярмошына канстатавала, што выбарчыя камісіі не маюць права ўмешвацца ў працу іншых дзяржаўных органаў, тым больш судоў. «Часта нам дасылаюць матэрыялы якой-небудзь грамадзянскай судовай справы. На гэта ёсць спецыяльны парадак і заканадаўства, не злучанае з выбарчым. Таму мы і дапамагчы грамадзяніну зусім не можам», — заўважыла старшыня Цэнтрвыбаркама.

### НА СЕЛЬСКІМ УЗРОЎНІ — АДЗІНЫ ВЫБАРЧЫ ФОНД

Старшыня Цэнтрвыбаркама паведаміла, што на ўзроўні большасці Саветаў не было нават спроб сфарміраваць выбарчыя фонды кандыдатаў.

— На сельскім узроўні толькі адзін кандыдат у дэпутаты адкрыў рахунак. На пасялковым — ніводны. На раённым узроўні можна казаць прыкладна аб 2% кандыдатаў, якія пажадалі адкрыць выбарчыя фонды, але ўжо на ўзроўні абласцей — гэта каля 25%. У Мінску дзесьці 50% зарэгістраваных кандыдатаў адкрылі свае выбарчыя фонды, — сказала старшыня ЦВК.

Яна адзначыла, што змены ў заканадаўстве, якія тычацца фондаў, даюць пэўныя вынікі. «Нават я як выбаршчык ужо атрымала лістоўку ад кандыдата ў дэпутаты па маёй акрузе, выраблёную за сродкі яго выбарчага фонду. Думаю, што з цягам часу мы прыйдзем да нейкіх агульнапрынятых сусветных стандартаў, калі кандыдаты сапраўды ўдзельнічаюць у перадвыбарнай барацьбе», — дадала Лідзія Ярмошына.

### УДЗЕЛ ПАРТЫЙ

Лідзія Ярмошына лічыць, што на гэтым этапе выбарчай кампаніі партыі паводзяць сябе досыць актыўна. Прыкладна 10 з 15 зарэгістраваных партый маюць кандыдатаў у дэпутаты. «Праўда, галоўным чынам, гэта непартыйныя рухі, — заўважыла кіраўнік ЦВК. — З партыйных у нас вылучаліся, па-мойму, Камуністычная і Ліберальна-дэмакратычная партыі».

Яна ўдакладніла, што вялікая частка тых, хто ўдзельнічае і заяўляе пра сябе як пра партыйных кандыдатаў, — гэта асобы, якія вылучыліся шляхам збору подпісаў. Сярод агульнай колькасці кандыдатаў гэта нязначныя лічбы — каля 5%.

Лідзія Ярмошына лічыць, што пытанне пераходу ад мажарытарнай да прапарцыйнай выбарчай сістэмы для Беларусі не актуальнае. «Нашы выбаршчыкі цікавяцца персаналіяй, а не палітычнай платформай. Усе жадаюць бачыць пэўны чалавечы твар з яго поспехамі або няўдачамі», — растлумачыла яна.

### БОЛЬШАЯ ЧАСТКА ВЫДАТКАЎ — НА ЗАРОБКІ

75% выдаткаў на правядзенне выбараў, калі не больш, складае заработная плата членаў участковых выбарчых камісій, прычым яна вельмі маленькая, паведаміла кіраўнік ЦВК. «Я магу сказаць, што без падаткаў гэтая сума будзе складаць каля Br200 тыс. Гэта вельмі невялікія грошы за 14 гадзін працы, таму што 12 гадзін працуе выбарчы ўчастак і яшчэ дзве-тры гадзіны доўжыцца падлік галасоў», — сказала Лідзія Ярмошына.

Яна растлумачыла, што гэтыя выплаты не з'яўляюцца заработнай платай, таму што выбарчыя органы — гэта часовыя грамадскія фарміраванні, якія не валодаюць правамі юрыдычнай асобы і не прымаюць нікога на працу, за выключэннем асобных грамадзянска-прававых дагавораў, якія складаюць камісіі, напрыклад, па напісанні шыльды, афармленні выбарчага ўчастку або на транспартныя паслугі. «Гэта невялікая ўзнагарода, якую атрымаюць члены выбарчых камісій, галоўным чынам, за дзень выбараў», — падкрэсліла старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі.

### ГАЛАСАВАННЕ ПА ПОШЦЕ — ЗАЎЧАСНАЕ

«Магчымасць галасавання па пошце мы не разглядаем, хоць, магчыма, для правядзення галасавання за мяжой гэта трэба ўвесці, як у Амерыцы. Бо ў ЗША не ствараюць участкаў для галасавання за мяжой. Грамадзяне, якія пражываюць за мяжой (а іх мільёны), галасуюць па пошце. Магчыма, у будучыні і нам трэба пераходзіць на падобнае. Але паколькі ў нас галасаванне нават на ўчастках заўсёды выклікае вельмі шмат папрокаў і абвінавачванняў, уводзіць у такія тонкія палітычныя працэсы пошту, я думаю, заўчасна», — лічыць Лідзія Ярмошына. Яна мяркуе, што прадстаўнікі апазіцыйнай палітычнай супольнасці, апаненты ўлады, журналісты падвергнуць такое рашэнне рэзкай крытыцы.

Да таго ж замежныя псіхолагі сцвярджаюць, што такі тып галасавання не павялічвае актыўнасць выбаршчыкаў, а, наадварот, памяншае, заўважыла старшыня камісіі.

Скептычна аднеслася Лідзія Ярмошына і да прапановы размясціць выбарчыя ўчасткі ў гіпермаркетах. «Тады нам трэба зыходзіць ад спісаў выбаршчыкаў, якія складаюцца па месцы жыхарства, і, як у Латвіі, даваць выбаршчыку магчымасць галасаваць дзе заўгодна. Але тады трэба ставіць адпаведны штамп у пашпарце, каб выбаршчык не прагаласаваў паўторна ў іншым месцы», — адзначыла старшыня ЦВК.

Да таго ж, калі адмовіцца ад спісаў выбаршчыкаў, галасаваць можна будзе толькі з пашпартам, падкрэсліла яна. Цяпер у Беларусі можна прагаласаваць, прадставіўшы іншы дакумент, калі ён выдадзены ў дзяржаўным ведамстве і мае фота ўладальніка. Сярод такіх дакументаў — пенсійнае пасведчанне, студэнцкі білет, пасведчанне дзяржслужачага. «Але гэта магчыма пры адной умове: прозвішча павінна быць занесена ў спіс выбаршчыкаў; калі яго ў гэтым спісе няма, то па іншым дакуменце прагаласаваць нельга, таму што няма доказаў таго, што выбаршчык пражывае на гэтым выбарчым участку; гэта даказвае толькі пашпарт», — растлумачыла Лідзія Ярмошына.

### УКРАІНА ПАКУЛЬ НЕ ЗАПРАСІЛА БЕЛАРУСКІХ НАЗІРАЛЬНІКАЎ

Прадстаўнікі ЦВК Беларусі не плануюць удзельнічаць у назіранні за датэрміновымі прэзідэнцкімі выбарамі ва Украіне, якія прызначаны на 25 мая, бо не атрымлівалі адпаведнага запрашэння ўкраінскага боку. Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі падкрэсліла, што з часоў аранжавага Майдана ў Кіеве ўкраінскія ўлады і арганізатары выбараў не вельмі ахвотна запрашаюць на падобныя выбарчыя кампаніі назіральнікаў ад СНД.

«Больш за тое, нейкі час нават не запрашаліся ні мы, ні дэпутаты парламента. Таму я не выключаю таго, што гэтае запрашэнне не будзе накіроўвацца ў краіны СНД», — сказала Лідзія Ярмошына.

Беларуская ЦВК не атрымлівала запрашэнне прыняць удзел у назіранні і за правядзеннем крымскага рэферэндуму, які запланаваны на 16 сакавіка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ СТАІЦЬ НА МЕСЦЫ

**У сакавіку стаўка рэфінансавання захаваецца на ўзроўні 23,5% гадавых. Такое рашэнне прынята праўленнем Нацыянальнага банка Беларусі.**

«Дынаміка інфляцыйных працэсаў з пачатку года складваецца вышэй за прагнозныя значэнні, — тлумачаць навіну ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. У лютым спажывецкія цэны павялічыліся на 2%, у студзені — на 1,6%». Таму з мэтай абмежавання інфляцыі і падтрымання прывабных умоў захоўвання рублёвых сродкаў у банках стаўка рэфінансавання ў сакавіку застанецца на ранейшым узроўні. «У далейшым Нацыянальны банк працягне аператыўны маніторынг стану эканомікі і грашова-крэдытнай сферы і будзе гнутка рэагаваць на сітуацыю, якая складваецца», — заявілі ў прэс-службе.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## У СТАЛІЦЫ БУДЗЕ ПАБУДАВАНА 12 АРЭНДНЫХ ДАМОЎ

**Гэтую навіну паведаміў на нарадзе ў мэрыі Мінска старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Фёдар Рымашэўскі. Агульная плошча такога арэнднага жылля павінна скласці 107,4 тысячы квадратных метраў. Спецыяліст адзначыў, што палова такіх дамоў будзе пабудавана і здадзена ў эксплуатацыю ў Першамайскім раёне (квартал «Магістр»), і па два дамы — у Маскоўскім і Заводскім раёнах.**

Між іншым, кіраўніцтвам мэрыі былі пастаўлены пытанні аб своечасовым засяленні ўжо пабудаваных арэндных дамоў. Адказным асобам даручылі падрыхтаваць графік засялення ў пабудаваныя арэндныя дамы, а адпаведную інфармацыя аб гэтым размясціць на сайтах раённых адміністрацыю Мінска.

На нарадзе прагучала інфармацыя аб тым, што за першыя два месяцы года ў Мінску пабудавана амаль чвэрць запланаванага на год жылля. Усяго ў студзені і лютым у горадзе здадзена ў эксплуатацыю 236 тысяч жыллёвых «квадратаў». Разам з тым цяпер у галоўным мегаполісе застаецца 22 дамы са звышнарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва. З іх тры аб'екты будуць дабудаваныя ў першай палове сакавіка, лічыць старшыня профільнага камітэта. Нагадаю, што сёлета ў сталіцы запланавана пабудаваць 1 млн квадратных метраў жылля.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШАЛЁНЫ ЯНОТ ПРЫКІНУЎСЯ МЁРТВЫМ...

**Двое жыхароў вёскі Бронная Гара Бярозаўскага раёна пацярпелі ад шалёнага янота. А прычынай стала іх крайняя неабачлівасць. Гэта ж трэба было дадумацца: зацягнуць дзікага звера ў свой дом!**

Але ўсё па парадку. Два браты сядзелі на лаўцы каля свайго дома, калі да аднаго з іх падкраўся янот і ўкусіў за руку. Пасля гэтага звер прыкінуўся мёртвым і прыняў характэрную позу. Тады маладыя людзі прынеслі звера ў хату і вырашылі, што можна выгадна прадаць яго скуру. А далей не знайшлі нічога лепшага, як прывязаць жывёліну нанач да ножкі стала. Калі ж няўдачлівыя гандляры «жывым футрам» заснулі, янот перагрыз вяроўку і накінуўся па чарзе на кожнага з братоў, моцна пакусаў іх за рукі. Потым пацярпелыя доўга лавілі звера па доме, нарэшце, аглушылі яго табурэткай і зачынілі ў ванным пакоі. Назаўтра настойлівыя ахвяры ляснога госця ўсё ж яго прадалі.

Але раны ад укусаў паказвалі на яўнае запаленне, і мясцовы супрацоўнік ФАПа адразу западозрыў вірус шаленства. Янота хутка знайшлі і адправілі ў лабараторыю, якая пацвердзіла небяспечную хваробу. Гора-паляўнічым на бясплатную пушніну быў прызначаны курс адпаведнага лячэння. У вёсцы аб'яўлены каранцін.

Як адзначыў намеснік начальніка Брэсцкай абласной інспекцыі па ахове жывёльнага і расліннага свету Сяргей Штык, трэба мець на ўвазе, што, калі звер спакойна гуляе па населеным пункце, — гэта першая прыкмета яго хваробы на шаленства. А калі ён яшчэ і нападае на людзей, сумнявацца амаль не даводзіцца. Чалавеку наогул не варта ўмешвацца ў свет дзікіх жывёл. Перасцярогай усім павінен паслужыць леташні трагічны выпадак у Камянецкім раёне. Тады мужчына праявіў яўную неабачлівасць, калі захацеў сфатаграфавацца побач з бабром. Звер перакусіў рыбаку артэрыю, і той загінуў ад страты крыві. Так што, калі гэта можна, лепш дзікага звера абысці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ПЕРШЫЯ АХВЯРЫ ВЕСНАВЫХ ПАЛАЎ

**У Ганцавіцкім раёне з-за выпальвання сухой расліннасці загінула пажылая жанчына.**

Каля 18 гадзін жыхарка вёскі Пералалокі ўбачыла чорны дым з боку суседняга прысядзібнага ўчастка. Абследаваўшы дом, нікога ў ім не знайшла. Абгарэлая 86-гадовая гаспадыня дома ляжала на выпаленай тэрыторыі... Жанчына пражывала адна. Мяркуецца, што трагедыя здарылася з-за яе неасцярожнасці пры выпальванні сухой травы. У той жа дзень у цяжкім стане ў магілёўскую бальніцу быў дастаўлены непрацуючы 1963 года нараджэння. Мужчына спрабаваў самастойна патушыць траву, якая гарэла ў полі каля дома. У выніку ён атрымаў апёкі канечнасцяў першай-трэцяй ступені. Пра загаранне травы ў вёсцы Нялідавічы Мінскага раёна паведамілі мясцовыя жыхары. Агонь распаўсюдзіўся на плошчы 1 гектара... Апроч заклікаў быць пільнымі, існуюць і меры адказнасці за выпальванне сухой расліннасці — штраф да 40 базавых велічынь. А за распальванне вогнішчаў у забароненых месцах — да 12 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Фінансы

# НАЦБАНК СТАНЕ АБАРОНЦАМ ПРАВОЎ СПАЖЫЎЦОЎ ФІНАНСАВЫХ ПАСЛУГ

## А банкі, якія не падтрымліваюць прынцып «нулявой адказнасці», будуць неканкурэнтаздольнымі

**На гэтым тыдні ў нашай краіне на базе вучэбнага цэнтра Нацыянальнага банка праходзіць пасяджэнне рабочай групы Альянса за фінансавую даступнасць (Alliance for Financial Inclusion) па абароне правоў спажыўцоў і паводзінах на рынку. Асаблівую актуальнасць мерапрыемства набывае ў сувязі з тым, што 15 сакавіка ў Беларусі адзначаецца Дзень спажыўца. Да таго ж наша краіна хутка можа стаць рэгіянальным лідарам у справе фінансавай даступнасці. Аб гэтым паведаміў Сяргей ДУБКОЎ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі.**

### СПАЖЫЎЦУ — ВЫБАР І ПРАЗРЫСТЫЯ ЎМОВЫ

«Разнастайнасць фінансавых інстытутаў, іх пагранічны стан, дэцэнтралізаваная сістэма рэгулявання фінансавага рынку, а таксама павышэнне попыту хатніх гаспадарак і фізічных асоб на фінансавыя паслугі гаворыць аб тым, што насельніцтва пастаянна сутыкаецца з новымі фінансавымі інструментамі, якія не заўсёды зразумелыя. Кліент павінен мець права выбраць: крэдыт у банку, пазыка ў мікрафінансавай арганізацыі ці ламбард. А мы павінны проста забяспечыць празрыстыя ўмовы, — заявіў Сяргей Дубкоў. — У бліжэйшы месяц мы плануем паўторна ўнесці праект указа кіраўніка дзяржавы аб рэгуляванні мікрафінансавых арганізацый. Пасля яго прыняцця Нацбанк стане рэгулятарам і гэтага сегменту рынку. Акрамя таго, сумесна з Паркам высокіх тэхналогій мы знаходзімся ў канцавой стадыі падрыхтоўкі праекта ўказа кіраўніка дзяржавы аб развіцці форэкс-кампаній. Паралельна мы займаемся павышэннем фінансавай адукаванасці і цяпер выступаем з ініцыятывай надання Нацыянальнаму банку статусу рэгіянальнага лідара ў супрацоўніцтве з Afi». Прадстаўнік галоўнага банка краіны сцвярджае, што гэта дазволіць атрымліваць метадалагічную і фінансавую дапамогу на арганізацыю працы па пашырэнні доступу фінансаў у нашай краіне. Тым больш што Альянс за фінансавую даступнасць, па словах Сяргея Дубкова, хутка стане міжнароднай арганізацыяй, супастаўнай з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця, Сусветным банкам і МВФ.

### ПАШЫРЭННЕ ПАЎНАМОЦТВАЎ НАЦБАНКА

Стала вядома пра тое, што структура па абароне правоў спажыўцоў на фінансавым рынку будзе створана ў Нацбанку Беларусі. «Нацыянальны банк пашырае свае паўнамоцтвы і кампетэнцыю ў рамках агульнадзяржаўнай праграмы па абароне правоў спажыўца. У сувязі з гэтым неабходна пашырэнне паўнамоцтваў у статуце Нацбанка і дакладнае вызначэнне персаналій, якія будуць весці гэтае пытанне», — тлумачыць намеснік старшыні праўлення Нацбанка. Сёння, як паведаміла **Ірына НАРКЕВІЧ, намеснік міністра гандлю Беларусі**, Мінгандаль з'яўляецца каардынатарам у нашай краіне сферы абароны правоў спажыўцоў, у тым ліку ў галіне фінансавых паслуг. «Прававая база ў нашай краіне развіта дастаткова, але мае права на ўдасканаленне, што вітаецца, асабліва ў сферы аказання фінансавых паслуг. Таму гэтым трэба займацца, што паспяхова і робіць Нацбанк», — удакладніла прадстаўнік міністэрства.

### НОВАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ПРАГРАМА, АЛЕ БЕЗ БЮДЖЭТНЫХ СРОДКАЎ

У межах гранта Альянса за фінансавую даступнасць Нацыянальны банк замовіў у профільнага інстытута пры Мінэканоміі праект канцэпцыі дзяржаўнай праграмы па пашырэнні доступу да фінансавых рэсурсаў для насельніцтва Беларусі на 2015—2020 гады. Пры падрыхтоўцы навуковага дакумента былі прааналізаваны пытанні доступу да фінансаў і абароны правоў спажыўцоў, праведзены аналіз існуючага заканадаўства і практыкі. «Цяпер гэты дакумент рыхтуецца да ўнясення ў Савет Міністраў. Пасля зацвярджэння сумесным рашэннем урада і Нацыянальнага банка гэтай канцэпцыі будзе распрацавана адпаведная дзяржаўная праграма», — паведаміў Сяргей Дубкоў. Пры гэтым ён падкрэсліў, што бюджэтныя сродкі не разглядаюцца як асноўныя крыніцы фінансавання. «Мяркуем, што ўдзельнікам фінансавання выступіць рынак. Як паказвае міжнародны вопыт, удзельнікі рынку гатовы ўкладваць у такія глабальныя праекты свае сродкі, веды і ўменні, таму што фінансавая стабільнасць — гэта залог іх паспяховага існавання і паспяховага развіцця краіны».

### ПРА ПРЫНЦЫП «НУЛЯВОЙ АДКАЗНАСЦІ»

Нядаўна Нацбанк рэкамендаваў камерцыйным банкам прымяняць да кліентаў — трымальнікаў плацежных картак прынцып «нулявой адказнасці» пры незаконным спісанні грошай з карткі. Сяргей Дубкоў пракаментаваў гэтую рэкамендацыю: «Краіне патрэбна павышэнне колькасці безнаяўных розннічных плацяжоў. Але для выканання гэтай задачы патрэбна і высокая бяспека такой паслугі. Хаця ў нас і вельмі невялікая колькасць выпадкаў махлярства з плацежнымі карткамі, усё роўна яны ёсць. І кожны такі выпадак выклікае рэзананс. Таму, прааналізаваўшы вопыт іншых краін, правёўшы адпаведныя кансультацыі з банкамі і праваахоўнымі органамі, Нацбанк выдаў рэкамендацыю, якая адназначна трактуецца, — выкарыстоўваць прынцып «нулявой адказнасці». Цяпер гэты прынцып рэальна выкарыстоўваецца нашымі найбуйнейшымі банкамі. Тыя банкі, якія не ўспрымаюць рэкамендацыі Нацыянальнага банка, становяцца неканкурэнтаздольнымі. Бо, калі кліент прыходзіць у банк, ён павінен задаць адно пытанне: «Ці далучаецеся вы да рэкамендацыі Нацбанка?». Калі банк кажа «не», кліент павінен разумець, што ўсе рызыкі ў выпадку махлярства кладуцца на яго плечы. А калі банк кажа «так», тады паміж банкам і кліентам устанаўліваюцца раўнапраўныя адносіны». Прадстаўнік Нацбанка выказаўся і наконт магчымых махлярстваў з боку саміх кліентаў: «Зразумела, ёсць такая небяспека. Аднак, калі банк западозрыць, што кліент сам спрабуе махлярнічаць, яго чакае крымінальная адказнасць».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

**ДАРЭЧЫ**

**Нацыянальны банк Беларусі ўступіў у Альянс за фінансавую даступнасць у 2010 годзе. Гэта фінансавая арганізацыя, якая аб'ядноўвае 117 удзельнікаў на ўзроўні цэнтральных банкаў, міністэрстваў і іншых рэгулятараў. Гэтая арганізацыя мае на мэце пашырэнне доступу да фінансаў і павышэнне фінансавай адукаванасці.**

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение
**«Минскстрой»**

УНП 100071325

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА**
**«Строительство многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств №№ 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой». Жилой дом № 11 по генплану» в г. Минске,**
*опубликованную в газете «Звязда» 4 октября 2013 года:*

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений № 1, № 2, № 4, № 5, № 10, № 12, № 15, № 16, № 17, № 19, № 22, № 23, № 24, № 29, № 30, № 31, № 33, № 38, № 40, № 42, № 45, № 46, № 48, № 49, с № 50 по № 111 с учетом выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, в текущих ценах составляет:

1-комнатных квартир – 13 332 977 руб.
2-комнатных квартир – 13 087 198 руб.
3-комнатных квартир – 12 759 493 руб.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

■ На слыху

# «МАРАЧНАЯ» СМЕРЦЬ

## Ахвярамі «кіслага д'ябла» сталі 7 чалавек

**Менш чым за два месяцы ў Мінску ад передазіроўкі так званымі «дызайнерскімі наркотыкамі» загінулі сем хлопцаў і дзяўчат ва ўзросце ад 14 да 25 гадоў. Варта адзначыць, што для іх бацькоў і знаёмых тое, што здарылася, стала сапраўднай нечаканасцю. Практычна ўсе маладыя людзі станоўча характарызаваліся па месцы працы і вучобы, займаліся спортам, не мелі шкодных звычак.**

Апошняя трагедыя здарылася 8 сакавіка ў мікраraёне Серабранка. Трэцякурснік сталічнага каледжа запрасіў да сябе ў госці 15-гадовую сяброўку. Пара паклала пад язык «маркі», якія хлопец купіў праз інтэрнэт. Пасля гэтага, знаходзячыся ў стане эйфарыі, хлопец прапанаваў дзяўчыне даказаць свае пачуцці: выскачыць з акна 6 паверха без адзення. Выратаваць жыццё хлопцу не ўдалося. Дзяўчыну шпіталізавалі з сур'ёзнымі траўмамі.

Учора на прэс-канферэнцыі **начальнік упраўлення Следчага камітэта па Мінску Дзмітрый КАНАПЛЯНІК** распавёў пра астатнія, больш раннія, 6 трагедый гэтага года.

У Заводскім раёне 19 студзеня дзяўчына 1995 года нараджэння набыла з сяброўкамі пакуначак з белым парашком, які змяшчаў псіхатропнае рэчыва, а таксама некалькі «марак». Праз тры гадзіны пасля іх ужывання яна пачала неадэкватна сябе паводзіць, перастала рэагаваць на тое, што адбывалася вакол, прынялася граміць кватэру, пасля чаго наступіла раптоўная смерць.

У Маскоўскім раёне сталіцы 20 студзеня ў кватэры знайшлі труп маладога чалавека 1992 года нараджэння. Ён таксама адпачываў у кампаніі сяброў, куды сам жа і прынёс 6 «марак». Хлопец ужыў толькі палову «маркі». Смерць наступіла праз дзве гадзіны ў выніку атручэння вельмі небяспечным псіхатропным рэчывам. Перад гэтым ён таксама паводзіў сябе неадэкватна, бегаў па кватэры, на просьбы сяброў не рэагаваў. Падчас правядзення следчых дзеянняў канфіскавалі 5 «марак». Таксама ў кішэні курткі загінулага знайшлі чэкі аб пераліку грашовых сродкаў на электронны кашалёк у сетцы электронных плацяжоў.

У Цэнтральным раёне 12 лютага з кватэры ў беспрытомным стане ў бальніцу з дыягназам «атручэнне невядомым таксічным рэчывам» даставілі дзяўчыну 1996 года нараджэння, студэнтку БДУ. Яна памерла, не прыходзячы ў прытомнасць. За некалькі гадзін да смерці яна разам са сваім маладым чалавекам ужыла «марку», насычаную невядомым рэчывам. Пасля гэтага ўзніклі ўжо апісаныя вышэй сімптомы. Хлопец выжыў дзякуючы таму, што, адчуўшы здранцвенне канечнасцяў і іншыя сімптомы, своечасова выплюнуў небяспечны кавалачак паперы.

У Ленінскім раёне 17 лютага каля гадзіны ночы ў машыне хуткай дапамогі памёр школьнік. Як высветлілася, ён напярэдадні ў інтэрнэце набыў дзве «маркі»...

21 лютага ў Савецкім раёне Мінска таксама ў машыне хуткай дапамогі памёр хлопец 1995 года нараджэння. Перад гэтым ён адпачываў у кампаніі і ненадоўга адлучыўся. Калі вярнуўся, стаў паводзіць сябе неадэкватна, сяброў не чуў. Раптам у маладога чалавека спынілася дыханне. Прыбыўшыя ўрачы канстатавалі смерць.

27 лютага ў адной з кватэр у Першамайскім раёне знайшлі труп мужчыны 1990 года нараджэння. Следчыя ўстанавілі, што хлопец таксама ў кампаніі сяброў набыў праз інтэрнэт некалькі «марак». Іх ужылі двое з тых, хто знаходзіўся ў кватэры. Пасля гэтага ў абодвух праявіліся аналагічныя прыкметы вострага таксічнага атручэння. Адзін з іх выбег на вуліцу, яму выклікалі «хуткую». Другі хлопец памёр.

Усе трагічныя выпадкі, паводле слоў Дзмітрыя Канапляніка, аб'ядноўвае адно і тое ж псіхатропнае рэчыва, нанесенае на кавалачак паперы — так званую «марку», адна і тая ж схема пакупкі і продажу — праз інтэрнэт. На адным баку гэтых «марак» намалявана галава жывёлы чырвонага колеру з рагамі. У моладзевым асяроддзі іх называюць яшчэ «лістамі д'ябла». Перад смерцю маладыя людзі клалі кавалачкі паперы з невядомым рэчывам пад язык. Усе «маркі» выраблены саматужным спосабам: кампаненты для іх вытворчасці прыбываюць паасобку, затым змешваюцца і наносяцца на «марку». На дзвюх «марках», якія канфіскавалі праваахоўнікі, канцэнтрацыя небяспечнага рэчыва адрознівалася ажно ў 10 разоў (!).

Дзмітрый Канаплянік дадаў, што па фактах гібелі маладых людзей заведзены крымінальныя справы, праводзяцца судовыя экспертызы. «Звязда» будзе сачыць за ходам следства.

**Надзея ПАЎЛАВА**

■

■ Фінансавы выдатнік

# МАЁМАСНЫ ЛІЗІНГ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

## Такі фінансавы інструмент дапаможа нам у жыллёвым пытанні

**Менавіта магчымасць перадачы маёмасці ў лізінг фізічнай асобе можа паспрыяць беларусам вырашаць кватэрныя праблемы, упэўнены спецыялісты банкаўскага сектара. Такі інструмент пачне ў нас рэальна дзейнічаць пры ўмове дадатковай карэкціроўкі падатковага заканадаўства і захавання стабільнасці абменнага курсу, лічыць начальнік упраўлення лізінгу Альфа-Банка (Беларусь) Надзея Кушнерава.**

Нагадаю, што Указ № 99 «Аб пытаннях рэгулявання лізінгавай дзейнасці», які прадугледжвае перадачу маёмасці ў лізінг фізічным асобам у асабістых мэтах, уступіць у сілу сёлета з 1 верасня. Спецыялісты адзначаюць, што новая кватэра або аўтамабіль з'яўляюцца абсалютна рэальнымі аб'ектамі лізінгу, у адрозненне ад бытавой тэхнікі ці нават новага дарагога адзення. Спадарыня Кушнерава адзначае, што аб'ектам лізінгу павінны выступаць такія рэчы, якія будуць дастаткова ліквіднымі ў выпадку ўзнікнення неабходнасці іх канфіскацыі ў кліента і наступнай рэалізацыі трэцім асобам.

Эксперт патлумачыла, што лізінг прынцыпова адрозніваецца ад крэдыту ў частцы правоў уласнасці. Пры крэдытаванні банк дае кліенту неабходную яму суму грошай: шляхам залічэння на картку, выдачы наяўных на рукі або прамым плацяжом на рахунак прадаўца. У любым з гэтых варыянтаў пакупніком маёмасці з'яўляецца не банк, які прадаставіў грошы, а сам кліент — крэдытаатрымальнік. Набытая маёмасць пераходзіцьва ўласнасць кліента, дзе, часцей за ўсё, падобная здзелка прадугледжвае і механізм залогу.

А вось пры лізінгу кліент выбірае маёмасць і яе прадаўца, паказвае іх даныя ў заяўцы, на падставе якой лізінгадавец (напрыклад, банк) набывае ўказаную маёмасць і перадае яе кліенту ў карыстанне. Прычым кліент не з'яўляецца ўласнікам маёмасці, а толькі яе карыстальнікам, як пры арэндзе. Уласнікам актыву да заканчэння тэрміну лізінгу і выплаты лізінгаатрымальніку ўсіх неабходных плацяжоў па здзелцы з'яўляецца фінансавая ўстанова, якая заключае дагавор куплі-продажу (напрыклад, на кватэру) ад свайго імя.

Зразумела, што ключавым крытэрыем пры выбары паміж крэдытаваннем і лізінгам для людзей будзе канчатковы, з улікам усіх рэальных выплат, кошт прапановы фінансавых рэсурсаў. У існуючых на беларускім рынку ўмовах стаўкі па лізінгу роўныя, а ў пэўных выпадках (пры прыцягненні да працэсу пасрэднікаў) перавышаюць стаўкі крэдытнага рынку. У гэтым выпадку кошт рэсурсаў для спажыўцоў залежыць і ад сістэмы падаткаабкладання лізінгавых аперацый. Справа ў тым, што цяпер даходы ад лізінгу, якія атрымлівае банк, абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць (ПДВ ) па стаўцы 20%, а працэнты па крэдыце абкладанню ПДВ не падлягаюць. Такім чынам, па сістэме лізінгу для фізічных асоб кошт фінансавых рэсурсаў робіцца аўтаматычна даражэйшым на суму ПДВ адносна плацяжоў па крэдыце пад аналагічную стаўку гадавых.

Пры існуючым заканадаўстве сістэма лізінгу сапраўды працуе пакуль толькі для юрыдычных асоб, якія потым вяртаюць такі падатак праз механізм «заліку» шляхам памяншэння агульнай сумы ПДВ, якая падлягае выплаце ў бюджэт. Такім чынам, лізінг стане эканамічна больш выгадным для насельніцтва, толькі калі стаўка па ім стане значна ніжэй, чым па крэдыце, або калі такія здзелкі вызваляць ад аплаты ПДВ.

Спецыяліст нагадала і аб існуючай практыцы фінансавання кліентаў з выкарыстаннем так званага псеўдавалютнага лізінгу. Сутнасць гэтага інструмента заключаецца ў тым, што рэсурсы выдаюцца ў беларускіх рублях, але працэнтная стаўка выкарыстоўваецца ў замежнай валюце, а ўсе плацяжы прывязаны да эквіваленту замежнай валюты ў беларускіх рублях на дату плацяжу. Тады кліент атрымлівае адносна нізкую стаўку, але менавіта на яго ўскладаецца ўся рызыка, якая звязана са змяненнем курсу нацыянальнай валюты, бо менавіта ад дынамікі абменнага курсу будзе залежаць выніковы кошт атрыманых па лізінгу рэсурсаў.

Пры існуючай стаўцы па крэдыце ў беларускіх рублях і псеўдавалютнага лізінгу апошні стане для кліента больш выгадным, калі паслабленне курсу айчыннай валюты складзе не больш за 1,15% у месяц на працягу ўсяго тэрміну лізінгу, падлічылі банкаўскія эксперты.

У сувязі з гэтым Надзея Кушнерава падкрэсліла, што для эфектыўнага развіцця лізінгу для насельніцтва неабходна, перш за ўсё, ажыццявіць адмену абкладання ПДВ у частцы лізінгавай стаўкі. Акрамя таго, сёння кліент павінен вельмі ўзважана падыходзіць да заключэння дагавора лізінгу з прывязкай да курсу валюты.

○○○

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

■ Законы рынку

# ПЕРАРАДЖЭННЕ

| по оплате труда | 635 | 1342 | 630 |
| по лизинговым платежам | 636 | 637 | – |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 4 | – |
| в том числе: | | | |
| в бюджет | 637а | 4 | – |
| авансовые поступления в счёт вкладов в уставный капитал | 637б | – | – |
| прочим кредиторам | 638 | 74 | 194 |
| в т.ч. инвестиционному фонду Минстройархитектуры | 638а | – | – |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 650 | – | – |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | – | – |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | – | – |
| **Итого по разделу 5** | **690** | **15447** | **19137** |
| **Баланс** | **700** | **79629** | **37908** |

### ОТЧЁТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь—декабрь 2013 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь - декабрь 2013 года | За январь - декабрь 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 49602 | 29121 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 48004 | 30029 |
| Валовая прибыль (010 - 020) | 030 | 1598 | (908) |
| Управленческие расходы | 040 | ( – ) | ( – ) |
| Расходы на реализацию | 050 | ( – ) | ( – ) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 1598 | (908) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 4097 | 1041 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (5878) | (6374) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | (183) | (6241) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 975 | 10441 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 126 | 9837 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | – | – |
| проценты к получению | 103 | 4 | 29 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 845 | 575 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (321) | (2630) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | 132 | 2598 |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | 189 | 32 |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | – | – |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | – | – |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | – | – |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | ( – ) | ( – ) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | – | – |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | – | – |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | – | – |
| Иные доходы и расходы | 140 | – | – |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140) | 150 | 654 | 7811 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150) | 160 | 471 | 1570 |
| Налог на прибыль | 170 | (453) | (1508) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 180 | – | – |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 190 | – | – |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | ( – ) | (956) |
| Прибыль (убыток), перераспределяемые в пределах юридического лица | 205 | – | – |
| Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200 + 205) | 210 | 18 | (894) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 2324 | 3595 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | – | – |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 2342 | 2701 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию, рублей | 250 | 5 | (242) |
| Разводнённая прибыль (убыток) на акцию, рублей | 260 | – | – |

Руководитель В.В. Лосев

Главный бухгалтер Н.В. Сусько

Дата составления: 28.02.2014 г.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 15.04.2014 в 10.00 по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского,19, конференц-зал.**

Организатором аукциона является

### РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком»,

находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

| № лота | Площадь, предлагаемая в аренду, кв.м/ Коэффициент по п.8.2. | Начальная цена лота, БАВ/ рублей | Размер задатка, БАВ/ рублей | Характеристика |
|---|---|---|---|---|
| | **Помещение 1-го этажа** Капитального строения (здание автоматизированной телефонной станции-2), **Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Якуба Коласа, 14** | | | Помещение находится на 1-м этаже четырехэтажного здания. Здание расположено в центральной части города. В помещении имеется естественное освещение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизировано. Помещение находится в удовлетворительном состоянии, не используется с января 2014 г. |
| № 1 | **21,1 кв.м.** Коэффициент– **3,0** | 0,5275/ 45 365 | 5,275/ 453 650 | |

Шаг аукциона – 10%, срок аренды – не менее 3-х лет;

Цель использования: для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офисов, складских помещений, для оказания услуг.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 13.03.2014 по 14.04.2014 (с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням) по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, пом. 1, кабинет 509 п. Документы, поданные после 17.00 14.04.2014, не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9.00 до 10.00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.**

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с № 3012072841543 в филиале № 200 – Витебском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300977657, Витебский филиал РУП «Белтелеком»;

- подает заявление на участие в аукционе;

- заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;

- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;

- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка; 2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись; 3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей – подписания протокола о результатах аукциона; оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды; возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; заключения договора аренды:

Участник аукциона, ставший победителем аукциона (единственным участником аукциона), уплачивает штраф в размере 15% от начальной цены продажи Объекта.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона уплачивает штраф в размере 15% от начальной цены продажи Объекта.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

**Телефоны для справок (0212) 27-29-42, 27-11-58, факс (0212) 27-18-81.**
**e-mail: kovalenko_ea@vitebsk.beltelecom.by**

■ Кампетэнтна

# «УНІВЕР» СА СМАКАМ

## У адзінай у краіне ВНУ харчавання рыхтуюць не толькі спецыялістаў, але і патрыётаў

**Не раз прыходзілася чуць, як замежныя госці нахвальвалі беларускія прадукты. І «малочка» смачная, і «кандытарка» — вышэйшы клас, і мясныя вырабы «самае тое».Чаго ўтойваць: здабыткі айчынных вытворцаў харчовай прамысловасці нярэдка адзначаюцца на сусветных выставах. І тут супрацоўнікам Магілёўскага ўніверсітэта харчавання, адзінай у краіне ВНУ, якая спецыялізуецца выключна на падрыхтоўцы кадраў для харчовай галіны, ёсць чым ганарыцца. Цэлы шэраг іх распрацовак не толькі адзначаны ўзнагародамі, але ўкаранёны ў вытворчасць і карыстаюцца поспехам у спажыўцоў. Сёння на прылаўках крам прадаецца некалькі дзясяткаў розных найменняў сыроў, сокаў, він, кансерваў з гародніны і садавіны, зробленых па рэцэптурах навукоўцаў. Нават ікры, якую герой камедыі Леаніда Гайдая «Іван Васільевіч мяняе прафесію» называў «заморскай», некалькі найменняў. Не выключана, што ў хуткім часе на стале спажыўца з'явіцца новая распрацоўка ўніверсітэта — кансервы... для пажылых.**

***Аб тым, чым сёння жыве самая «смачная» ВНУ краіны, гаворка з яе рэктарам, доктарам навук, прафесарам Вячаславам ШАРШУНОВЫМ.***



— Пачну з невялікага ўдакладнення: мы доўгія гады былі адзінай ВНУ, якая кавала кадры для харчовай прамысловасці, і толькі ў апошнія 5 гадоў спецыялістаў па асобных кірунках пачалі рыхтаваць і ў іншых ВНУ — Гродна, Брэста і Мінска. Але наогул увесь спектр спецыяльнасцяў, якія ахопліваюць харчовую прамысловасць, прадстаўлены толькі ў нашым універсітэце.

У моладзі асабліва карыстаюцца поспехам такія спецыяльнасці, як тэхналогія перапрацоўкі малака, мяса, а таксама прадуктаў з іх, хлебапячэння, кандытарскіх, крупяных, макаронных вырабаў і харчовых канцэнтратаў, тэхналогія прадукцыі грамадскага харчавання. На іх падчас уступнай кампаніі прэтэндуюць да 3 чалавек на месца. Нават летась, калі былі павышаны «мінімальныя» прахадныя балы, кандыдатаў хапала.

**— Наколькі запатрабаваны вашы спецыялісты?**

— У нас стапрацэнтнае размеркаванне. Летась мы працаўладкавалі больш чым 300 чалавек. Знайшлі працу і для 56 платнікаў, якія звярнуліся да нас з прапановай пасадзейнічаць. Сёння цяжка «ідзе» спецыяльнасць «Тэхналогія хімічных валокнаў». Гэтаму «садзейнічае» тое, што цяпер наш магілёўскі хімічны гігант перажывае не лепшыя часы. Але гэта вельмі перспектыўная спецыяльнасць. На ААТ «Магілёўхімвалакно» ў нас два філіялы, дзе трэцякурснікі праходзяць практыку і займаюцца лабараторнымі работамі. Цяпер на гэтым прадпрыемстве разглядаецца цікавы праект, які фінансуюць кітайскія інвестары. Спадзяёмся, што становішча там у хуткім часе палепшыцца.

**— А не прыходзіцца чуць ад працадаўцаў, што маладых спецыялістаў пасля ВНУ трэба перавучваць? Маўляў, адна справа — тэорыя, і іншая — практыка.**

— Мы маем 18 філіялаў на вытворчасцях, каб, пачынаючы з 3 курса, лабараторныя заняткі для студэнтаў праходзілі непасрэдна на прадпрыемствах. І калі на ААТ «Магілёўхімвалакно» філіялы былі і раней, то астатнія з'явіліся ў апошнія 10 гадоў. Яны ёсць у Быхаве на кансервава-агароднінасушыльным заводзе, у холдынгу «Бабулін гладыш» (наша кафедра тэхналогіі малака і малочных прадуктаў каля 20 гадоў працуе з гэтым прадпрыемствам, у нас шмат агульных распрацовак), на фабрыцы марозіва. Рыхтуем спецыялістаў для кампаніі «Савушкаў прадукт». Нашы кандытары запатрабаваны на прадпрыемствах «Слодыч», «Камунарка», «Спартак»...

**— Вы кіруеце ўстановай ужо больш за 10 гадоў. Што за гэты час змянілася?**

— Павялічылася колькасць спецыяльнасцяў і спецыялізацый. Цяпер іх 12 і 25, адпаведна. Сёлета будзе весціся набор па новай (дарэчы, вельмі запатрабаванай сёння) спецыяльнасці «Прыродаахоўная дзейнасць». Гэтыя спецыялісты будуць забяспечваць кантроль за экалогіяй на тэрыторыі прадпрыемстваў. Яшчэ адна спецыялізацыя — «Інфармацыйныя тэхналогіі» — з'явіцца крыху пазней.

**— Змяняюцца тэхналогіі, мадэрнізуецца вытворчасць. Як паспяваеце за прагрэсам? Што робіце для таго, каб тыя веды, якія атрымлівае студэнт, адпавядалі сучаснаму ўзроўню?**

— На сёння ВНУ скончылі каля 27 тысяч чалавек. Каля 60% інжынерна-тэхнічнага персаналу ў харчовай прамысловасці, 80% галоўных тэхнолагаў на прадпрыемствах па перапрацоўцы малака, мяса, сокаў — гэта нашы выпускнікі. Падтрымліваем стасункі з навукова-практычным цэнтрам у Мінску, Белхарчпрамам. Нашы былыя студэнты працуюць у розных міністэрствах, ВНУ.

Навучальны працэс вядзецца з улікам апошніх нованўвядзенняў, якія дыктуе час. Мы знаходзімся ў цэнтры Еўропы і калі не будзем на іх рэагаваць, то застанемся незапатрабаванымі. Сёння ўсюды жорсткая канкурэнцыя. Універсітэт заключыў 45 дагавораў аб супрацоўніцтве з замежнымі ВНУ і арганізацыямі з Балгарыі, Італіі, Германіі, Казахстана, Кітая, Польшчы, Літвы, Расіі, Украіны. Не так даўно дэлегацыя нашых навукоўцаў і студэнтаў выехала на стажыроўку ў Польшчу. Цесныя сувязі ў нас з Плоўдзіўскім універсітэтам харчовых тэхналогій у Балгарыі, перыядычна выязджаем у Германію, Італію. Падчас канікул нашы студэнты з кафедры тэхналогіі прадукцыі грамадскага харчавання праходзілі практыку ў Расіі, працавалі кухарамі і афіцыянтамі на комплексе па турыстычных паслугах у Падмаскоўі. Дарэчы, узначальвае яго наш выпускнік, які родам з Бабруйска.

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

***Вячаслаў Шаршуноў — рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Аўтар 51 падручніка, навучальных і даведачных дапаможнікаў, кніг, а таксама 341 навуковай і навукова-метадычнай работы, 73 вынаходак. Пад яго навуковым кіраўніцтвам абаронены 1 доктарская і 14 кандыдацкіх дысертацый. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і знакам Мінадукацыі РБ «Выдатнік адукацыі». Лаўрэат спецыяльнай прэміі Магілёўскага гарвыканкама «Дасягненне». Рашэннем Магілёўскага аблвыканкама яго імя занесена ў «Кнігу славы Магілёўшчыны». Па выніках працы за 2010 год прызнаны лаўрэатам прэміі Магілёўскага аблвыканкама «Чалавек года».***

**— Якія вашы распрацоўкі ўкараняюцца на прадпрыемствах? Наогул, што можна сказаць пра вынікі навуковых даследаванняў?**

— На кафедрах універсітэта працуе 312 выкладчыкаў, у тым ліку 2 члены-карэспандэнты НАН Беларусі, 11 дактароў і 112 кандыдатаў навук. Ва ўніверсітэце сфарміраваліся 9 навуковых школ.

Распрацоўкі нашых навукоўцаў неаднаразова адзначаліся медалямі, дыпломамі і граматамі на міжнародных прамысловых кірмашах у Германіі, Кітаі, Азербайджане, Польшчы, Расіі, Літве, Сербіі, ва Украіне, іншых краінах. Цяпер па нашых тэхналогіях на Магілёўскай малочнай кампаніі «Бабулін гладыш» вырабляюць брынзу, плаўленыя сыр «Фермер», мяккія сыры «Магілёўскі» і «Майскі», сырную масу «Хутаранка» і шмат чаго іншага. На Быхаўскім кансервава-агароднінасушыльным заводзе ўкаранёны новыя віды кансерваў з гарбуза, морсы з садавіны, розныя нектары з мякаццю. Дарэчы, морс з чарнаплоднай рабіны прайшоў клінічныя выпрабаванні, у выніку якіх была даказана эфектыўнасць выкарыстання яго ў лячэнні артэрыяльнай гіпертэнзіі. Па нашых рэцэптурах прадпрыемства «Камака плюс» выпускае 4 віды маянэзаў і такую ж колькасць кетчупаў, 3 віды таматных соусаў з агульным эканамічным эфектам больш чым на 120 мільёнаў рублёў. Камбінаты хлебапрадуктаў асвоілі вытворчасць цэлага шэрагу новых відаў мучных паўфабрыкатаў, распрацаваных супрацоўнікамі ўніверсітэта.

**— Як «упісваецца» ў гэтую работу грамадская дзейнасць і наколькі актыўна ў ёй удзельнічаюць студэнты?**

— З 2007 года я ўзначальваю Магілёўскую арганізацыю рэспубліканскага аддзялення грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Мне імпануе тое, што гэтае аб'яднанне кансалідуе тых, хто спрабуе захаваць усе лепшыя набыткі нашага народа — і духоўныя, і ідэалагічныя. Вельмі прыемна, што ёсць моладзь, якая гэта падтрымлівае. Выдзяляем сродкі для ветэранаў, праводзім конкурсы, віншуем вучняў з Днём ведаў, аказваем дапамогу інвалідам і сіротам. Стала добрай традыцыяй уручаць ад «Белай Русі» падарункі для немаўлят, якія нарадзіліся ў Дзень Незалежнасці краіны.

**— А што сёння прываблівае моладзь? Што можа стаць для яе арыенцірам?**

— Трэба знайсці тую нацыянальную ідэю, якая будзе даспадобы кожнаму. Галоўныя прыярытэты — гэта наша гісторыка-культурная спадчына, народныя традыцыі. Прыстойнасць, працавітасць, павага да іншых нацый — такі вобраз сёння склаўся аб беларусах у свеце, і мы павінны яго захаваць. Гэта базавыя пастулаты, на якіх фарміруецца ідэалогія. Нельга казаць, што тут усё атрымліваецца. Нехта разглядае Захад выключна з прывабнага пункту погляду. Але там нічога проста так не робіцца. Калі я ў 1986 годзе быў у ЗША ў якасці стажора, звярнуў увагу на тое, што нават цемнаскуры дворнік, які падмятаў вуліцу, насвістваў гімн ЗША... А мы вельмі лёгка расстаёмся са сваімі здабыткамі. Але калі няма нейкага стрыжня, адбываецца тое, што цяпер ва Украіне.

Успамінаецца 1992 год, калі я быў рэктарам Горацкай сельгасакадэміі. Да нас прыехаў Станіслаў Шушкевіч, які на той час быў кіраўніком краіны. І калі я падчас свайго выступлення звярнуў увагу на тое, што трэба аднавіць у навучальных установах выхаваўчую працу, Шушкевіч мяне раскрытыкаваў. Але я ўсё роўна ў 1993 годзе аднавіў у акадэміі пасаду прарэктара па выхаваўчай рабоце. Праз некалькі гадоў гэтыя пасады з'явіліся і ў іншых ВНУ. Я лічу: тое, што сёння створана, дазваляе каардынаваць работу ў студэнцкіх калектывах. І праца з моладдзю не павінна абмяжоўвацца нейкімі пустымі абяцаннямі ці заклікамі. Трэба, каб яны адчувалі, што аб іх таксама клапоцяцца. Мы імкнёмся стварыць спрыяльныя ўмовы для вучобы студэнтаў — вось зрабілі рамонт асноўнага корпуса, сёлета абновім і другі. Калі чалавеку камфортна, ён не глядзіць у іншы бок. У ідэалогіі, як і ў жыцці, дробязяў не бывае...

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

## Маладыя вучоныя: «ВАРЫЦЦА ВА ЎЛАСНЫМ СОКУ — НЕЦІКАВА»

**«Погляды маладых навукоўцаў на сваю кар'еру і прафесійны рост істотна адрозніваюцца ад уяўленняў, уласцівых старэйшаму пакаленню», — такую думку агучыў старшыня Савета маладых навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Андрэй ІВАНЕЦ падчас інтэрнэт-відэабрыфінгу на партале Саюзнай дзяржавы.**

— Без рэальнага бачання таго, што адбываецца ў свеце, развівацца дастаткова складана. Таму для таго, каб вынікі работы адпавядалі чаканням моладзі, трэба максімальна выкарыстоўваць магчымасці, якія прадастаўляюцца еўрапейскай і ўвогуле сусветнай навуковай супольнасцю, — падкрэсліў Андрэй Іванец. — У першую чаргу, трэба максімальна актыўна выкарыстоўваць гранты і праграмы, якія рэалізуе Еўрасаюз.

Маладым вучоным трэба выязджаць за мяжу і ўдзельнічаць у розных міжнародных праектах, прэзентаваць вынікі сваёй навуковай дзейнасці на міжнародных канферэнцыях і сімпозіумах. Тым больш што пры правядзенні такіх мерапрыемстваў практычна заўсёды ствараецца фонд, скіраваны на фінансавую падтрымку маладых навукоўцаў, якія прадстаўляюць на канферэнцыі найбольш цікавыя вынікі.

Старшыня Савета маладых навукоўцаў паведаміў, што ўжо стартавала VIII рамачная праграма навукова-тэхналагічнага развіцця ЕС «Гарызонт—2020», якая прадугледжвае магчымасць выезду беларускіх навукоўцаў на міжнародныя стажыроўкі і работу ў інтэрнацыянальных навуковых калектывах практычна па ўсіх навуковых кірунках. Праграма скіравана, у першую чаргу, на магчымасць прафесійнага росту маладых вучоных і іх уваходжанне ў інтэрнацыянальную навуковую супольнасць. Гэта цудоўны інструмент для рэалізацыі навуковых ідэй.

Адказваючы на пытанне, ад чаго залежыць паспяховая будучыня беларускай навукі, Андрэй Іванец падкрэсліў, што без пільнай увагі да падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі, нават пры ўмове вялікіх фінансавых укладанняў у навуку, навуковаму сектару складана будзе развівацца. Таму трэба наноў перагледзець ланцужок «школа—універсітэт—магістратура—аспірантура» для таго, каб забяспечыць прыток у навуку людзей, якія мэтанакіравана рыхтаваліся да далейшай навуковай дзейнасці.

Разам з тым, калі раней можна было зрабіць адкрыццё без задзейнічання новага сучаснага высокатэхналагічнага абсталявання, умоўна кажучы, адкрыць закон сусветнага прыцягнення, седзячы пад дрэвам, то цяпер зрабіць грандыёзнае адкрыццё без спецыялізаванага абсталявання немагчыма.

— Я мяркую, што трэба зрабіць наступнае. Па-першае, зразумець, у якіх кірунках трэба развівацца беларускай навуцы, вызначыць і расставіць прыярытэты, паколькі ахапіць абсалютна ўсе кірункі ў нашай адносна невялікай краіне праблематычна, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Андрэй Іванец. — Па-другое, мы павінны надаць асаблівую ўвагу сістэмнай падрыхтоўцы навуковых кадраў. І па-трэцяе, каб увасобіць нашы ідэі, задумы і ініцыятывы ў жыццё, патрабуецца фінансавая дапамога...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Будзь у курсе!

## ЯК СТАЦЬ ГІМНАЗІСТАМ?

**Кантрольныя лічбы набору ў гімназіі павінны быць зацверджаны іх заснавальнікамі да 10 красавіка. А конкурсны адбор у 5-я класы гімназій пройдзе сёлета з 2 па 10 чэрвеня. Аб гэтым журналісту «Звязды» паведамілі ў Міністэрстве адукацыі.**

Для будучых гімназістаў пад правядзенне ўступных экзаменаў забраніраваны наступныя дні: 3 чэрвеня пройдзе дыктоўка па рускай мове, 5 чэрвеня дзеці будуць здаваць матэматыку ў пісьмовай форме, а 7 чэрвеня — пісаць дыктоўку па беларускай мове. 9 чэрвеня — рэзервовы дзень для тых, хто прапусціў экзамен па ўважлівай прычыне.

Пры паступленні ў гімназіі-каледжы мастацтваў вучні здаюць адзін, так бы мовіць, прафільны экзамен па мастацтве плюс матэматыку і экзамен па беларускай ці рускай мове (па выбары). Уступныя экзамены ў гімназіі-каледжы мастацтваў па вучэбных прадметах «беларуская мова», «руская мова» і «матэматыка» будуць праводзіцца ў тэрміны, устаноўленыя для ўсіх гімназій, а іспыты па мастацкіх дысцыплінах (музыцы, малюнку, вакале і г.д.) пройдуць 2 чэрвеня.

Згодна з дзейным заканадаўствам, пры прыёме ў гімназіі, гімназіі-інтэрнаты, гімназіі-каледжы мастацтваў улічваюцца як вынікі ўступных іспытаў па экзаменацыйных дысцыплінах, так і гадавыя адзнакі па іх, атрыманыя асобамі, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, пасля завяршэння навучання і выхавання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў 2014 годзе. Такім чынам, максімальная сума балаў, якую можа набраць вучань пры паступленні, складае 60. У Міністэрстве адукацыі ўпэўнены, што залічэнне ў гімназію з улікам гадавых адзнак павышае прэстыж той адзнакі, якую дзіця зарабіла за папярэднія чатыры гады навучання: яна перастае быць фармальнай. Акрамя таго, чым большая колькасць адзнак бярэцца пад увагу, тым меншая верагоднасць у прэтэндэнтаў на званне гімназіста набраць аднолькавую колькасць балаў.

Варта мець на ўвазе, што пры роўнай колькасці балаў пераважнае права на залічэнне ў гімназіі будуць мець дзеці з больш высокім сярэднім балам гадавых адзнак за чацвёрты клас, а ў гімназіях-каледжах мастацтваў — дзеці з больш высокім узроўнем здольнасцяў у асобных відах мастацтваў.

У Міністэрстве адукацыі звяртаюць увагу на тое, што, згодна з дзейным парадкам прыёму ў гімназічныя ўстановы, не дапускаецца ўключэнне ў экзаменацыйныя камісіі настаўнікаў, якія працавалі з дзецьмі ў 4-х класах або ажыццяўлялі рэпетытарства ці аказвалі кансультацыйныя паслугі па экзаменацыйных прадметах.

Загад аб залічэнні вучняў у гімназіі, гімназіі-інтэрнаты, гімназіі-каледжы мастацтваў павінен быць афармлены не пазней за 12 чэрвеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

# ЛЮДЗІ СПЯШАЮЦЦА, БЯГУЦЬ І НЕ АДКАЗВАЮЦЬ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Спачатку, калі я толькі пачала ездзіць на далёкія адлегласці адна, былі такія моманты, — успамінае Кацярына. — Напрыклад, я пытаюся, які маршрут, і мне адказваюць: 46-ы. Я саджуся, а ён аказваецца 40-м і вязе мяне кудысьці на вуліцу Розы Люксембург. Я там ніколі не была і не ведаю, як адтуль выбрацца. Памятаю, гэта была субота, сярэдзіна дня. Тралейбус практычна пусты. Калі я звярнулася да людзей па дапамогу, адгукнуўся толькі п'яненькі дзядзечка з задняй пляцоўкі. Выйшла я з ім на прыпынку. Ён кудысьці пайшоў, сказаўшы: «Не хвалюйся, зараз даведаемся». Я стаю і думаю: «Дзе гэта я? І вернецца гэты дзядзечка ці не»? Ён, на шчасце, вярнуўся і перасадзіў мяне на 29-ы тралейбус. Я даехала на ім да знаёмага прыпынку «Раманаўская Слабада» і там выйшла...

Але потым я навучылася не панікаваць у такіх сітуацыях. Летась была буйная аварыя, і 9-ы тралейбус паехаў па іншым маршруце, кудысьці ў абход. Людзі вакол пачалі нервавацца, падыходзіць да кіроўцы, пытацца. А я пачала пытацца ў іх, дзе мне выйсці. Выходжу на тым прыпынку, дзе мне параілі, а за мной увязалася відушчая жанчына, якая таксама не ўяўляла сабе, як ёй дабрацца да месца прызначэння. Нам аказалася па дарозе. Я яе давезла да свайго прыпынку і патлумачыла, як ехаць далей... Так, я магу патрапіць у зусім непрадказальную сітуацыю, але калі быць гатовым да гэтага і не баяцца, то ўсё нармальна.

### «Не ведаю, можа, яны ўсе былі ў навушніках»...

Часам менавіта дзякуючы такім, як Кацярына, звычайныя «нармальныя» людзі могуць даведацца пра сябе нешта новенькае — і не заўсёды прыемнае...

— Бывае, навакольныя вядуць сябе не зусім адэкватна, хоць усё гэта з добрых памкненняў, — распавядае дзяўчына. — Аднойчы быў выпадак: я выходжу з тралейбуса на Захадзе-4, і мяне тут жа падхоплівае нейкі чалавек: «Я вас перавяду!». І цягне цераз дарогу! Але ж я ведаю, што тут нельга пераходзіць вуліцу падобным чынам, толькі праз падземны пераход! А я нават не магла супраціўляцца, бо зіма, слізка... Ён мяне перавёў, пакінуў на тратуары і пабег далей...

Кацярына кажа, што ў такіх выпадках звычайна ўсміхаецца і стараецца па-добраму растлумачыць чалавеку: «Дзякуй, я спраўлюся. Мне цяпер не патрэбна дапамога». «Часам невідушчыя злуюцца на такіх няпрошаных памочнікаў і адказваюць рэзка, — кажа яна. — Так рабіць, вядома, нельга, таму што такія паводзіны фарміруюць негатыўны вобраз невідушчых людзей. Я прымаю дапамогу, калі нам па дарозе».

Яна кажа, што нярэдка бывае складана даведацца нумар маршрута аўтобуса ці тралейбуса. «Даводзіцца пытацца ў навакольных. Часам здараецца так, асабліва ў цэнтры горада, што людзі спяшаюцца, бягуць і не адказваюць. У мяне нядаўна быў адзін выпадак на прыпынку на Гарадскім вале. Пачула, што падыходзіць тралейбус, і пытаюся ў людзей, прычым з усмешкай, нармальным голасам, не шэптам: «Скажыце, калі ласка, які гэта нумар»? Раз пытаюся, другі, трэці, чацвёрты... Ніхто так і не адказаў. Але такі выпадак быў толькі адзін. Ён мяне надзвычай уразіў, таму што гэта рэдкасць. Я чула: людзі на прыпынку былі, яны выходзілі, заходзілі ў тралейбусы... Я не ведаю, можа, яны ўсе былі ў навушніках...»

### «Шкада, што мала літаратуры, надрукаванай шрыфтам Брайля»

Кацярына працуе на ўнітарным прадпрыемстве «Звукотекс» ГА «БелТІЗ», галоўным вытворцы агучанай літаратуры ў Беларусі. Яна гукарэжысёр, запісвае аўдыякнігі для невідушчых. Але ў яе ёсць і яшчэ адна праца: яна выкладае нотную грамату для невідушчых дзяцей у музычнай школе.

— Бацькам сваіх вучняў я тлумачу, што тое, што іх дзеці не бачаць, — гэта не трагедыя, гэта не смяротна, — кажа яна. — Чалавек пры гэтым можа атрымаць адукацыю, навучыцца хадзіць па горадзе, рэалізаваць сябе, калі захоча. Нічога немагчымага няма. Галоўнае — захацець.

Сама Кацярына пасля школы паступіла ў музычны каледж для невідушчых і людзей са слабым зрокам у Курску. Яна «духавік», іграе на кларнеце. «Але я паспрабавала, калі вучылася, хоць бы патрошку, па паўгода, пайграць на самых розных інструментах, — распавядае яна. — Гэта вельмі спатрэбілася цяпер, таму што ў мяне нотнай грамаце вучацца самыя розныя дзеткі: піяністы, акардэаністы, флейтысты, гітарысты...».

❍❍❍

Сёння невідушчыя людзі могуць атрымліваць інфармацыю і быць у курсе ўсіх падзей нароўні з усімі астатнімі дзякуючы спецыяльным праграмам галасавога чытання з экрана камп'ютара. Гэта выдатна, лічыць Кацярына, але прызнаецца, што вельмі любіць чытаць.

— Калі чалавек аслеп у дарослым узросце, яму цяжэй навучыцца чытаць з дапамогай шрыфта Брайля. Такія людзі часта ўспрымаюць інфармацыю толькі на слых. Праўда і тое, што цяпер, са з'яўленнем камп'ютараў, многія не хочуць наогул вучыць Брайль. Гэта сумна. Але і на Захадзе, і ў нас з'яўляецца ўсё ж усведамленне таго, што Брайль патрэбны, трэба чытаць...

Праўда, літаратуры, надрукаванай шрыфтам Брайля, сёння ў Беларусі мала. У Расіі друкуюцца некаторыя выданні, і нават нотныя зборнікі. У нас — у асноўным толькі падручнікі. «Але мы таксама хочам чытаць, — усміхаецца Кацярына. — Хоць, калі я вучылася ў школе (гэта было ў 1990-я гады), сучасных падручнікаў, надрукаваных шрыфтам Брайля, у нас наогул не было...

### У Мінску не хапае агучаных святлафораў

Перашкод для невідушчага чалавека ў Мінску вельмі шмат. Напрыклад, яму няпроста прыходзіцца ў крамах самаабслугоўвання. Паспрабуй здагадайся, што там ляжыць на паліцы... Таму Кацярына стараецца ў адзіночку туды не хадзіць. «Памятаю, у Гродне ў адной краме была кнопка каля ўвахода, — распавядае яна. — Ты яе націскаеш, і па выкліку прыходзіць чалавек, які дапамагае невідушчаму прайсці па зале і выбраць неабходныя пакупкі. Для гэтага не трэба вылучаць дадатковую штатную адзінку, гэта можа быць нават падсобная рабочая, бо не так часта ў краму заходзяць сляпыя. Мне здаецца, калі б нашы крамы ўвялі такую практыку, ніхто ад гэтага б не пацярпеў, а вось невідушчыя людзі адчулі б сябе нашмат камфортней. Ды і на рэпутацыі крамы гэта б добра адбілася.

**У Мінску на 1.02.2014 года стаіць на ўліку ў «БелТІЗ» 1829 невідушчых людзей з інваліднасцю. Насамрэч гэта толькі члены «БелТІЗ» — невідушчых людзей, якія пражываюць у сталіцы, нашмат больш.**

— Небяспечныя для нас розныя дарожныя работы, раскопкі, асабліва на тратуары, — кажа дзяўчына. — Але з імі я сутыкаюся не так часта. Самая вялікая праблема, на мой погляд, гэта агучаныя святлафоры. Яны ёсць не ўсюды. Або яны ёсць, але жыхары бліжэйшых дамоў незадаволены, што яны занадта гучныя. Напрыклад, на скрыжаванні вуліц Багдановіча і Камуністычнай, побач з музычнай школай, дзе я працую, святлафор агучаны, але вельмі ціхі. А рух там вельмі сур'ёзны.

— Я не ведаю, дзе гэтая мяжа: каб не пакрыўдзіць жыхароў і каб засцерагчы нашых невідушчых дзяцей, — кажа мая суразмоўца. — Але я нядаўна была ў Курску і звярнула ўвагу на тое, што там практычна кожны святлафор агучаны.

### Часам бацькі робяць са свайго дзіцяці інваліда ў квадраце

— Вельмі многае залежыць ад таго, як ты сам сябе паводзіш, — разважае Кацярына. — Часам бывае снег, дождж, слізка. Было б нядрэнна, каб табе хто-небудзь дапамог. Але ты ідзеш з засяроджаным тварам, які здаецца панурым, таму што баішся паваліцца — і ніхто на цябе не зверне ўвагі. А іншы раз надвор'е добрае, ідзеш і ўсміхаешся — на кожным кроку дапамагчы прапаноўваюць! Таму, што б ні здарылася, трэба ўсміхацца. Тады людзі не шкадуюць цябе, а можа, дзесьці і дзівяцца: трэба ж, яна ідзе з белым кіем і яшчэ і ўсміхаецца!

Кацярына настроена аптымістычна. Усяму можна навучыцца, варта толькі захацець, лічыць яна.

— Але часам бывае так, што бацькі з самых лепшых памкненняў робяць са свайго дзіцяці інваліда ў квадраце, бо занадта апякуюць яго. Але так нельга, трэба вучыць дзіця быць самастойным. Я ведаю некалькі выпадкаў, калі такое дзіця едзе вучыцца куды-небудзь, напрыклад, у той жа Курск, — і з ім едзе мама. Жыве з ім, дапамагае яму ва ўсім. І потым атрымліваецца так, што чалавек быццам бы атрымаў адукацыю, але сябе абслужыць ён не можа. Не можа дайсці самастойна да бліжэйшай крамы, пошты... І каму такі чалавек будзе патрэбны? Патрэба ў ім будзе толькі ў тым выпадку, калі ён акажацца вельмі высакакласным спецыялістам, якіх няма сярод відушчых. Гэтаму вучыў мяне мой бацька, які таксама з'яўляецца невідушчым, і пры гэтым вельмі разумны, эрудзіраваны чалавек. Яшчэ калі я была маленькай, ён мне казаў: «Калі ты хочаш канкурыраваць са звычайнымі людзьмі, ты павінна быць на дзве галавы вышэйшай за іх у прафесійным плане». Гэта так, і гэта трэба ўлічваць. І, у прынцыпе, гэта магчыма.

Нельга патрабаваць ад людзей чагосьці: я інвалід, вы мне павінны. Для таго, каб нам былі нешта абавязаны, мы самі павінны быць цікавымі і карыснымі іншым людзям. Тады нас прымуць як паўнапраўных членаў грамадства і захочуць быць карыснымі нам...

**Святлана БУСЬКО.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Як палегчыць жыццё невідушчых людзей

**Намеснік старшыні Беларускага таварыства інвалідаў па зроку Міхаіл АНТОНЕНКА:**

Чаму невідушчыя людзі баяцца самастойна ездзіць па горадзе? Таму што гэта вельмі складана. Адна з праблем: як даведацца нумар аўтобуса, які падышоў да прыпынку? Часам падыходзіць некалькі аўтобусаў адначасова, людзі вакол спяшаюцца, могуць не пачуць невідушчага чалавека, а калі пачулі і сказалі нумар аўтобуса, той ужо зачыніў дзверы і ад'язджае...

У свеце, каб палегчыць жыццё невідушчых людзей, выкарыстоўваюцца розныя тэхналогіі. Напрыклад, на транспартным сродку над першымі дзвярыма размяшчаецца дынамік. А ў невідушчага чалавека з сабой пульт дыстанцыйнага кіравання. Калі ён стаіць на прыпынку і чуе, што падышоў аўтобус, ён націскае кнопку на пульце і чуе нумар маршрута. Больш за тое, гук задае яму кірунак руху: ідучы на яго, чалавек беспамылкова патрапіць у першыя дзверы аўтобуса.

Падобныя прылады нядаўна пачалі рэалізоўвацца ў нас, у Брэсцкай вобласці. Іх распрацоўшчыкам выступіла СКБ «Захад». У Мінску гэтая распрацоўка пакуль выкарыстоўваецца толькі на адной станцыі метро — «Кунцаўшчына». Наземныя транспартнікі адмаўляюцца ад выкарыстання падобнага абсталявання. Так, яна мае шэраг недахопаў. Але яе, у прынцыпе, гатовы дапрацаваць і запусціць «Інтэграл». Пытанне ў адным — у фінансаванні гэтай праграмы.

У нас выкарыстоўваецца транспарт беларускіх вытворцаў. Дык няўжо нельга даўкамплектаваць нашы аўтобусы і тралейбусы гэтым прыборам? Сёння кожны транспартны сродак укамплектаваны GPS-навігатарам, бягучым відэарадком. У апошні час з'яўляюцца валідатары. Усё гэта больш дарагія праекты. А кошт нашай прылады раўняецца кошту адной трацінны кола! Тым не менш, гэтую праблему мы пакуль вырашыць не можам.

❍❍❍

Таксама летась да нас паступілі 34 заяўкі ад невідушчых людзей на набыццё сабакі-павадыра. Але ў Беларусі няма школ сабак-павадыроў. Ёсць адна ў Расіі, але цана на такую сабаку непад'ёмная для нашага інваліда. Мяркуйце самі: аддаць трэба ад 20 тысяч долараў! Мы выступалі з прапановай адправіць за мяжу з мэтай навучання дрэсіроўцы сабак-павадыроў хаця б аднаго беларускага кінолага, але пакуль ніякага адказу не атрымалі.

Сёння мы сумесна са шведамі пачынаем рэалізацыю праекта, які датычыцца электронных павадыроў. Усё, што трэба для гэтага, — распрацаваць пешаходныя карты горада, дапамагчы набыць невідушчаму чалавеку смартфон з галасавымі праграмамі і навучыць яго карыстацца гэтым смартфонам. І сляпы чалавек зможа без асцярогі хадзіць па горадзе. Электронны павадыр нам здаецца больш перспектыўным і танным у параўнанні з выкарыстаннем сабакі-павадыра.

ААТ «Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод»

# МОЦНЫ БРЭНД І ЯКАСНЫ МЕНЕДЖМЕНТ

**Гэта прадпрыемства, якое думае аб сваёй дзелавой рэпутацыі і пастаянна ўмацоўвае пазіцыі на рынку. Гэта не тое прадпрыемства, якое трэба было прымушаць праводзіць мадэрнізацыю. У выніку правільнае рашэнне кіраўніцтва і прафесіяналізм работнікаў захавалі завод у шэрагах лідараў галіны. А рост экспарту штогод пацвярджае эфектыўнасць рэформаў. У завода ёсць усе складнікі паспяховай дзейнасці на рынку — сучасныя стандарты якасці, кампетэнтныя спецыялісты, гнуткі менеджмент і моцная рука кіраўніка, які думае ў першую чаргу аб будучыні прадпрыемства і дабрабыце работнікаў. Сёння Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод — гэта перадавое прадпрыемства, на якім для выпуску прадукцыі выкарыстоўваецца самае сучаснае абсталяванне, але пры гэтым за аснову бяруцца старадаўнія рэцэптуры і вопыт, назапашаны за доўгую паўтаравекавую гісторыю. Паглядзім, чым жыве прадпрыемства сёння.**



**Вядучы тэхнолаг Святлана РОГАЛЕВА:**

— Мы на месцы не сядзім. На дасягнутым не спыняемся. Канкурэнцыя вельмі вялікая, таму па-іншаму ў нас нельга. На заводзе вельмі цэняць работнікаў. Умовы для працы створаны дастойныя. Кожны за працоўнае месца трымаецца.

## Гісторыя прадпрыемства

*У 1852 годзе на маляўнічым узбярэжжы ракі Лабжанка нямецкія спецыялісты, па заказе памешчыка Карла Камінскага, пачалі будаваць рэктыфікацыйны завод. Менавіта на базе гэтага завода і было заснавана прадпрыемства.*

*У першы год савецкай улады завод быў нацыяналізаваны і працягнуў працу. У Вялікую Айчынную вайну прадпрыемству не пашанцавала: найбольш каштоўнае абсталяванне да вайны было адпраўлена ў тыл, а пры адступленні акупанты вывезлі рэктыфікацыйныя апараты. Усё астатняе абсталяванне ўзарвалі. Сам жа будынак ацалеў, і з 1944-га па 1950 год ішло аднаўленне завода. У сярэдзіне мінулага стагоддзя тут ужо дзейнічалі цэх рэктыфікацыі, цэх разліву, аддзяленне падрыхтоўкі посуду і лікёрны цэх.*

*За больш чым 150-гадовую гісторыю завод у Клімавічах назапасіў багаты вопыт у вытворчасці алкагольнай прадукцыі, змог захаваць і прымножыць лепшыя традыцыі. Дзякуючы гэтаму сёння прадпрыемства ведаюць не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі.*

## ГАЛОЎНАЕ — НЕ АБ'ЁМ

**Летам 2010 года на заводзе змянілася кіраўніцтва: пасаду генеральнага дырэктара заняў Мікалай БЯЛКО, прадаўжальнік вядомай і паважанай дынастыі вінаробаў. Яго бацька, Мікалай Трафімавіч Бялко, тры дзясяткі гадоў узначальваў мінскі «Крышталь». Таму новы дырэктар завода ў Клімавічах — сапраўдны прафесіянал, ён ведае справу «наскрозь». Не дзіўна, што прыход новага кіраўніцтва значна ажывіў працу прадпрыемства. Дырэктар пагадзіўся адкрыць нам сакрэт поспеху:**

— Я на ўласным вопыце ведаю: марка прадпрыемства — гэта перш за ўсё карпатлівая штодзённая праца ўсіх работнікаў. А канчатковы вынік — годная прадукцыя, у якасць якой кожны ўносіць сваю лепту. А сакрэт поспеху — традыцыі і вопыт у спалучэнні з сучаснымі тэхналогіямі. Наш завод — прадпрыемства з багатай гісторыяй. З 1858 года быў назапашаны вялікі вопыт па вытворчасці алкагольнай прадукцыі, а ў апошнія гады кампанія зрабіла тэхналагічны рывок — сёння тут выкарыстоўваюцца самыя сучасныя вытворчыя тэхналогіі, ажыццёўлена тэхнічнае пераўзбраенне і абноўлены асартымент. Усё гэта дазволіла заводу актыўна развівацца і нават у перыяд крызісу пашыраць геаграфію паставак, а таксама прывозіць вышэйшыя ўзнагароды з міжнародных выстаў і конкурсаў.

Мы зрабілі стаўку на рэалізацыю вопыту і ідэй прафесіяналаў — і гэта станоўча

**Палітыка кампаніі змянілася: цяпер важна не проста нарошчваць аб'ёмы вытворчасці, а паляпшаць якасць, пашыраць асартымент.**

адбілася на поспехах прадпрыемства: за апошнія пару гадоў Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод зведаў значныя змены і выйшаў на новы ўзровень развіцця з канкурэнтаздольнай прадукцыяй. Былі ўкаранёны новыя прагрэсіўныя рашэнні: мадэрнізавана вытворчасць, закуплена і ўстаноўлена сучаснае абсталяванне, абноўлена лінейка прадукцыі. Палітыка кампаніі змянілася: цяпер важна не проста нарошчваць аб'ёмы вытворчасці, а паляпшаць якасць, пашыраць асартымент.

Завод пачаў надаваць сур'ёзную ўвагу тэхнічнаму пераўзбраенню вытворчасці і яе ўдасканаленню. А мінімальны ўдзел чалавечага фактару ў тэхналагічным працэсе гарантуе высокую і пастаянную якасць тавару: ад распрацаванай рэцэптуры тут не адступаюць ні на крок. Вынікам усёй работы па мадэрнізацыі можна назваць выхад прадпрыемства на новы ўзровень якасці прадукцыі.

Вельмі вялікую ўвагу мы надаём не толькі тэхнічнаму пераўзбраенню, але і прасоўванню прадукцыі. Спецыялісты аддзела маркетынгу разам са службай галоўнага тэхнолага і вытворчай лабараторыі працуюць над з'яўленнем новых відаў прадукцыі, займаюцца пошукам новых прывабных відаў тары. І за нядоўгі перыяд працы ўжо відаць вынік: асартымент кардынальным чынам абнавіўся, а тыя віды прадукцыі і ўзоры афармлення, якія не карысталіся попытам, былі выключаныя з вытворчасці. Замест іх з'явілася новая прадукцыя, якая адпавядае патрабаванням сучаснага рынку і патрэбам пакупнікоў. Усе гэтыя мерапрыемствы дазваляюць прадпрыемству не толькі пашыраць рынкі збыту, займацца пошукам патэнцыйных партнёраў, але і актыўна ўмацоўваць свае пазіцыі на рынку ў якасці дзелавога партнёра.

## «СА СТА МАГЧЫМЫХ БАЛАЎ АЎДЫТАРЫ СА СЛАВЕНІІ ПАСТАВІЛІ НАМ 94...»

**Галоўны інжынер ААТ «Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод» Аляксандр НАПРЭЕНКА расказвае, як праходзіла мадэрнізацыя прадпрыемства і да якіх вынікаў прывяла.**

**— Сёння ўсе кажуць аб мадэрнізацыі наступнае: больш зарабляць, менш выдаткоўваць і гэтак далей. Як гэта адбываецца ў вас?**

— Наша аб'яднанне пачало мадэрнізацыю ў 2009 годзе. Па выніках аўдытарскай праверкі мы паставілі ў наступным годзе дадатковую італьянскую ўстаноўку для ачысткі вады з нашых свідравін. Таксама мы сталі змяншаць спажыванне газу на вытворчасць прадукцыі. Раней было каля 9,6-9,8 м кубічных на 1 дал. Па сусветных стандартах, нармальным расходам газу з'яўляецца каля 6 м кубічных. У нас цяпер атрымліваецца 5,3-5,4 м кубічных. Мадэрнізацыя дазволіла практычна ў два разы знізіць энергаспажыванне. У грашовым выражэнні мы штомесяц эканомім каля 86 тысяч долараў. Выраслі знізіць кошт з дапамогай зніжэння спажывання энергарэсурсаў. Для гэтага мадэрнізавалі абсталяванне, якое пачало працаваць з частковым энергазберажэннем. Ва ўсіх мадэрнізаваных частках вытворчасці мы зменшылі спажыванне рэсурсаў і энерганосьбітаў. Цалкам аўтаматызавалі тэхналагічны працэс. Уявіце сабе: вышыня цэха — каля 27 метраў, гэта пяціпавярховае збудаванне. Калі адзін чалавек кіраваў бы рознымі апаратамі на розных паверхах, то ён бы не змог гэтага зрабіць. Спатрэбіліся б 2-3 чалавекі. А сёння ўсё аўтаматызавана. Работнік сядзіць у апаратарскай і ўсім кіруе з камп'ютара. Выстаўляюцца параметры, а далей камп'ютар кірауе ўсім тэхналагічным працэсам. Мадэрнізаваны былі і лініі 70-80-х гадоў. Італьянская лінія дае магчымасць выпуску звычайнай прадукцыі. І яшчэ адна лінія дазваляе працаваць з рынкам — рознае афармленне прадукцыі.

**Мадэрнізацыя дазволіла практычна ў два разы знізіць энергаспажыванне. У грашовым выражэнні мы штомесяц эканомім каля 86 тысяч долараў.**

**— Які эфект ад эканоміі быў для людзей?**

— Калі б мадэрнізацыі не было, то не было б ужо і гэтага завода. Павялічаны якасць аховы і ўмоў працы. Чалавек не атрымлівае апраменьвання, не чуе шуму. Работнік сядзіць асобна, у апаратарскай, і працуе з камп'ютарнай тэхнікай. Таксама мы праводзілі прэміраванне работнікаў, якія актыўна ўдзельнічалі ў мадэрнізацыі. Уклалі ў яе каля 52 мільярдаў рублёў. Тэрмін акупляльнасці складае каля 5,5 года. Гэта лічыцца вельмі эфектыўным праектам.

**— А як працуеце на экспарт?**

— Ад экспарту нашай прадукцыі мы атрымалі летась каля 2 мільёнаў долараў. Працавалі з рознымі краінамі — Германіяй, Расіяй, Казахстанам, Эстоніяй, Літвой, Латвіяй. Без такога шырокага рынку сёння не выжыць. На нашай тэрыторыі не хапае прасторы для развіцця. Таму мы максімальна выходзім на экспарт. А замежнікам трэба, каб было танна і якасна. На тое і была накіравана мадэрнізацыя. А ўвогуле складана працаваць, бо паўсюль падтрымліваюць свайго вытворцу. Калі параўнаць акцызы, то ў нас каля 9 еўра, а, напрыклад, у Казахстане толькі 2,5. А мы знаходзімся ў Адзінай эканамічнай прасторы. Аднак у 2012 годзе мы вельмі моцна выраслі — больш чым на 20%.

**— Ад чаго залежыць попыт на вашу прадукцыю?**

— Попыт мае сезонны характар. Таму мы ў патрэбныя моманты альбо павялічваем, альбо змяншаем вытворчасць.

**— Як праводзіцца кадравая палітыка на прадпрыемстве? Чым заахвочваеце работнікаў?**

— Клімавічы — гэта невялікі гарадок. І людзі лаяльна ставяцца да завода як да працадаўцы. Мы не імкнёмся перацягнуць да сябе ўжо гатовых спецыялістаў з іншых прадпрыемстваў. Наша палітыка накіравана на выхоўванне сваіх работнікаў. У Магілёве ёсць Універсітэт харчавання. Мы з ім вельмі шчыльна супрацоўнічаем. Бяром да сябе технолагаў, механікаў, майстроў. На нашай базе яны практыкуюцца, навучаюцца. За апошнія тры гады мы навучылі 9 спецыялістаў. І яны стараюцца сюды потым размеркавацца. А ім мы ўжо прадастаўляем жыллё.

**— У чым бачыце далейшае развіццё прадпрыемства?**

— Няма межаў дасканаласці. Таму будзем павышаць якасць. А таксама зніжаць сабекошт. Абавязкова яшчэ павялічым аўтаматызацыю. Уся наша вытворчасць сертыфікавана. Будзем імкнуцца да міжнародных стандартаў, каб выйсці стала на міжнародны рынак. Была ўкаранёна сістэма IFS, без якой не хацелі з намі працаваць у Германіі. Са ста магчымых балаў аўдытары са Славеніі паставілі нам 94.

**— Чуў, што хочуць стварыць аб'яднанне вытворцаў вашага профілю. Як вы да гэтага ставіцеся?**

— Размовы аб гэтым ідуць, але сёння я не бачу базы для такога аб'яднання. Існуе сем буйных і шмат малых прадпрыемстваў. Для таго, каб іх аб'яднаць, патрэбны адпаведныя намаганні. Тым больш пры аб'яднанні кагосьці выкінуць. Ды і хто будзе кіраваць?

**— У чым прынцып вашай працы?**

— Самым галоўным у нашым іміджу павінна быць якасць.

### Этапы мадэрнізацыі

Спіртасховішча ў 2010-2011 гады было мадэрнізавана: фізічна і маральна састарэлыя ёмістасці дэманталі і замянілі сучаснымі. Касцюковіцкаму спіртзаводу, які ўваходзіць у склад Клімавіцкага завода, таксама надаецца вялікая ўвага: яшчэ ў 2009 годзе там была праведзена мадэрнізацыя брагарэктыфікацыйнай устаноўкі, у чэрвені 2010-га — уведзена ў эксплуатацыю новае варачнае аддзяленне, летась у верасні адкрыта новае брадзільнае аддзяленне.

Капітальны рамонт свідравіны глыбінёй 174 метры адбыўся ў жніўні 2012 года. У эксплуатацыю была ўведзена асобная новая траса ад свідравіны да ўчастка разліву. Замянілі і астатняе састарэлае абсталяванне на новае і сучаснае. Пасля гэтага якасць значна палепшылася — была атрымана вада з неабходным солевым складам і высокімі арганалептычнымі характарыстыкамі.

## ЯКАСЦЬ ПАЦВЯРДЖАЕЦЦА ЎЗНАГАРОДАМІ

Завод штогод прымае ўдзел у многіх нацыянальных і замежных выставах-дэгустацыях, кірмашах і прэзентацыях. І рэгулярна займае прызавыя месцы. Гэта павышае імідж завода і яго прадукцыі, дапамагае ўпэўнена адчуваць сябе на ўнутраным і знешнім рынках.

Прадукцыя прадпрыемства заваёўвае шматлікія ўзнагароды ажно з 1994 года. За гэты час атрымана безліч медалёў, дыпломаў, Гран-пры. Толькі за апошні час — больш за тры дзясяткі ўзнагарод:

- ✓ **два залатыя медалі і Гран-пры «Маскоўскага міжнароднага конкурсу спіртоў»;**
- ✓ **залаты і сярэбраны медалі на «Міжнародным дыгустацыйным конкурсе алкагольнай прадукцыі», а таксама сярэбраны медаль на «Міжнародным дыгустацыйным конкурсе «Лепшая гарэлка» ў межах выставы «Прадэкспа-2014» у Маскве;**
- ✓ **тры дыпломы на конкурсе-дэгустацыі «ГУСТ-2013»;**
- ✓ **2 Гран-пры і тры дыпломы на народным конкурсе дэгустацыі «Чэмпіён Густу» падчас Прадэкспа-2013;**
- ✓ **дыплом на VII універсальнай выставе-кірмашы «Лістапад»;**
- ✓ **3 залатыя і сярэбраны медалі, Гран-пры Міжнароднай выставы «Віно-гарэлка 2013», г. Сочы;**
- ✓ **2 залатыя і 2 сярэбраныя медалі Міжнароднага дэгустацыйнага конкурсу «Ялта. Залаты Грыфон»;**
- ✓ **перамогі ў Рэспубліканскім конкурсе спажывецкіх пераваг «Прадукт года 2012» і шмат іншых.**




## ПАСТАЯННАЕ ЎДАСКАНАЛЕННЕ

**Намеснік начальніка лабараторыі ААТ «Клімавіцкі ЛГЗ» Таццяна АГЕЕВА лічыць, што на заводзе працуюць сапраўдныя майстры:**

— Людзі, якія займаюцца гэтым няпростым рамяством, павінны мець, перш за ўсё, талент, прафесіяналізм, упартасць, эмацыянальнасць і азарт. За час свайго існавання — больш за 155 гадоў — завод не толькі захаваў старажытныя традыцыі і рэцэптуры, але і прафесійна спалучае іх з апошнімі тэхнічнымі дасягненнямі. Вялікае значэнне пры вырабе прадукцыі мае якасць вады. Таму на прадпрыемстве пастаянна ідзе праца па ўдасканаленні тэхналагічных працэсаў. Сёння для ачысткі пітной вады выкарыстоўваюцца фільтры абезжалезвання, змякчэння, зваротна-асматычная сістэма, а таксама фільтры з выкарыстаннем вугалю са шкарлупіны какосавых арэхаў.

Для паляпшэння якасці сыравіны праведзена рэканструкцыя на Касцюковіцкім спіртзаводзе. На прадпрыемстве пастаянна вядзецца строгі кантроль за якасцю прадукцыі, у тым ліку ўваходны кантроль сыравіны і матэрыялу, аперацыйны кантроль кожнай партыі, якая выпускаецца. Выпрабаванні праводзяцца ў вытворчай лабараторыі, якая акрэдытавана на адпаведнасць патрабаванням СТБ ИСО/МЭК 17025.

## БУДУЧЫНЯ — ЗА БЯСПЕЧНАЙ ПРАДУКЦЫЯЙ

Асноўныя фактары, якія вызначаюць канкурэнтаздольнасць прадукцыі, — якасць і бяспека.

Для забеспячэння якасці прадукцыі на Клімавіцкім лікёра-гарэлачным заводзе ў 2001 годзе была ўкаранёна і сертыфікавана сістэма менеджменту якасці на ўвесь асартымент. Таму прадукцыя адпавядае патрабаванням СТБ ISO 9001. Менеджмент якасці дазволіў скаардынаваць дзейнасць па кіраўніцтве прадпрыемствам. Цяпер дасягнута нагляднасць дзейнасці прадпрыемства праз дакладны, лаканічны, зручны для ўспрымання аналіз і апісанне.

У 2011 годзе на прадпрыемстве была ўкаранёна і сертыфікавана сістэма кіравання бяспекай харчовай прадукцыі на аснове аналізу небяспек і кантрольных крытычных кропак (ККТ) — сістэма НАССР. У 2013 годзе яна была пашырана на ўсю вытворчасць. У выніку — павялічаны вытворчы кантроль на розных этапах тэхналагічнага працэсу і зменшана верагоднасць выпуску неадпаведнай прадукцыі. Забяспечана якасць і бяспека прадукцыі на ўсім харчовым ланцужку (ад атрымання сыравіны да канчатковага прадукту). Укараненне сістэмы НАССР дазволіла гарантаваць спажыўцам максімальную бяспеку, пашырыць прысутнасць на ўнутраным рынку, павялічыць продажы і павысіць канкурэнтаздольнасць. Акрамя таго, прадпрыемства ўкараніла сістэму IFS на адпаведнасць патрабаванням Міжнароднага харчовага стандарту, што дало магчымасць пашырыць геаграфію экспарту і павялічыць пастаўкі.

ААТ «Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод», УНП 700103211.
Ліцэнзія Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі РБ 03220/81 ад 24.04.2004 г. да 23.04.2014 г.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, Аляксандр ФУРСАЎ. Фота з архіва прадпрыемства.**

ПРАЗМЕРНАЕ ЎЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ ШКОДЗІЦЬ ЗДАРОЎЮ!

# Краіна здароўя

Выпуск № 4 (315)

■ Прафілактыка раку

# ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ ЖАНЧЫНАМ РАБІЦЬ ГЭТА?

**За апошнія 10 гадоў захваральнасць на злаякасныя новаўтварэнні вырасла прыкладна на 30 працэнтаў. Такая тэндэнцыя назіраецца амаль ва ўсіх краінах свету. І асноўнай прычынай такога становішча лічыцца павелічэнне працягласці жыцця. Злаякасныя новаўтварэнні — гэта захворванні людзей пераважна пажылога ўзросту. А значыць, чым даўжэй будзе працягласць жыцця, тым вышэй будзе анкалагічная захваральнасць. Смяротнасць жа ад злаякасных захворванняў знізілася на 8 працэнтаў. Па прычыне ўкаранення новых пратаколаў дыягностыкі і лячэння. Гэтыя пратаколы, завяраюць спецыялісты, строга вытрымліваюцца ва ўсіх адпаведных установах аховы здароўя.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Карчма «Чабарок» у вёсцы Камуна

**У Доме культуры вёскі Камуна працуе карчма-фітабар «Чабарок», якім шмат гадоў загадвае вядомы на Любаншчыне культработнік Ірына Яскевіч. Кожнае лета Ірына Васільеўна збірае зёлкі, сушыць у адпаведнасці з народнымі традыцыямі.**

**— Да нас з задавальненнем наведваецца вясковая моладзь, але старэйшыя жыхары любяць пакаштаваць гарбату з розных зёлак, — кажа Ірына Яскевіч.**

***Намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар Сяргей КРАСНЫ звяртае ўвагу кожнага беларуса на некалькі важных момантаў:***

Па меркаванні экспертаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, можна папярэдзіць да 30 выпадкаў усіх новаўтварэнняў. Гэта дасягаецца з дапамогай прафілактыкі і ранняга пачатку лячэння.

Структура захваральнасці на злаякасныя новаўтварэнні пастаянна мяняецца. Сёлета ўпершыню ў структуры захваральнасці на анкалогію мужчын на першае месца выйшаў рак прастаты (абагнаў рак страўніка і рак лёгкага). Рост тлумачыцца павелічэннем працягласці жыцця мужчын і паляпшэннем дыягностыкі, а менавіта даступнасцю правядзення аналізу на выяўленне прастатспецыфічнага антыгену. У жанчын на першым месцы застаецца рак скуры. Аднак, паколькі ў гэтага захворвання добрыя вынікі лячэння (5-гадовая выжывальнасць набліжаецца да ста працэнтаў), анколагі большую ўвагу надаюць агрэсіўнаму раку малочнай залозы.

У Беларусі штогод выяўляецца каля 42 тысяч новых выпадкаў раку. Паводле прагнозаў, гэтая лічба будзе расці.

Летась каля 900 хворых на рак адмовіліся ад лячэння. Палова такіх пацыентаў — з 1—2-й стадыямі захворвання, калі вынікі лячэння былі б найлепшымі! Галоўным чынам, адмаўляюцца людзі ва ўзросце пасля 70 гадоў, з цяжкімі спадарожнымі захворваннямі. Аднак ёсць і больш маладыя пацыенты, якія спрабуюць лячыцца нетрадыцыйнымі метадамі.

Рак заўсёды мае прычыну. Хоць бываюць сітуацыі, калі не ўдаецца яе дакладна ўстанавіць. У маладым узросце часцей «спрацоўвае» спадчынны фактар, мутацыі генаў, якія перадаліся ад блізкіх сваякоў. Нельга скідваць з рахунку і пасіўнае курэнне. Яно павялічвае рызыку ўзнікнення злаякасных пухлін на 20 працэнтаў. Уплываюць і стрэсавыя сітуацыі.

1—2-я стадыі раку, як правіла, не заяўляюць пра сябе непрыемнымі сімптомамі, а рэгулярнымі штогадовымі прафілактычнымі абследаваннямі многія проста грэбуюць. Таму 35 працэнтаў выпадкаў злаякасных пухлін выяўляецца на позніх стадыях.

На ўліку ўстаноў аховы здароўя знаходзяцца 250 тысяч пацыентаў.

**Што спрыяе ўзнікненню злаякасных пухлін?**

**1.** Курэнне. 30 працэнтаў смерцяў ад анкалагічных захворванняў здараецца па прычыне тытунёвага ўздзеяння на арганізм.

**2.** Атлусценне. Звязана з шэрагам розных пухлін. Вядома, што кожныя 5 лішніх кілаграмаў у параўнанні з нармальнай вагой — ужо фактар рызыкі.

**3.** Недахват руху. Штодня чалавеку патрабуюцца прагулкі працягласцю ў адну гадзіну.

**4.** Няправільнае харчаванне. Прафілактычным эфектам у дачыненні да раку валодаюць амега-3 тлустыя кіслоты. Спрыяюць раку кіслоты амега-6. У рацыёне сучаснага чалавека гэтыя суадносіны складаюць 1:15 замест 1:1. Амега-3 змяшчаюцца ў марскіх прадуктах, фруктах і гародніне. Амега-6 — у чырвоным мясе. Свой шкодны ўнёсак робіць схільнасць да смажанага, вэнджанага і салодкага. Да прадуктаў, якія прафілактуюць розныя віды пухлін, адносяць тры віды алеяў (аліўкавы, рапсавы, ільняны), зялёны чай. Амерыканскі інстытут па даследаванні раку рэкамендуе прытрымлівацца правіла «2/3 талеркі». Гэтыя дзве трэція павінны займаць фрукты і гародніна. 1/3 — посныя мясныя прадукты, рыба і морапрадукты. Прасцей кажучы, кожнаму чалавеку неабходна штодня ўжываць не менш за 400 г фруктаў і гародніны.

**5.** Інфекцыі. Ад віруснага ўздзеяння ўзнікаюць рак шыйкі маткі і рак печані. Аднак ад вірусаў папіломы чалавека, гепатыту B і C можна прышчапіцца.

**6.** Стрэс. Значэнне маюць не толькі адмоўныя, але нават станоўчыя перажыванні. Задача кожнага чалавека — пазбаўляцца наступстваў такога ўздзеяння, вучыцца расслабляцца з дапамогай актыўнага ладу жыцця, чытання кніг, праслухоўвання класічнай музыкі і г.д.

— Каля 8 працэнтаў гібелі нашых пацыентаў прыпадае на пухліны ротавай поласці. І тут узнікае пытанне: хто павінен быў хадзіць да ўрача-стаматолага, праводзіць лячэнне зубоў? — кажа **загадчык аддзела арганізацыі супрацьракавай барацьбы РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, кандыдат медыцынскіх навук Павел МАІСЕЕЎ.** — Для прафілактыкі раку шыйкі маткі дастаткова рэгулярна наведваць урача-гінеколага. Хто ці што перашкаджае жанчынам рабіць гэта? Дарэчы, за мяжой ужываецца такі тэрмін як «лад жыцця, што захоўвае здароўе». Не «здаровы лад жыцця», а менавіта лад, які захоўвае... На жаль, нашы людзі схільныя складваць з сябе адказнасць за стан свайго здароўя, а ў выпадку ўзнікнення захворвання — вінаваціць урачоў...

■ Доктар адкажа

# МОЖА, АПЕНДЫЦЫТ?

***«Нагадайце, калі ласка, боль якога кшталту характэрны для апендыцыту?***

**Лілія, г. Гродна»**

**Загадчык хірургічнага аддзялення 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Віктар ШВЕДАЎ:**

— Востры апендыцыт — захворванне, якое патрабуе тэрміновага аператыўнага ўмяшання. Чым раней яго ажыццявіць, тым лепш. Тады пасляаперацыйныя раны загойваюцца праз 7-10 дзён, хворы выпісваецца дадому і праз 3-4 тыдні ўжо можа выйсці на працу.

Калі ж пацыент паступае ў бальніцу позна — праз суткі і больш з моманту пачатку захворвання, то выздараўленне зацягваецца. Узнікаюць розныя ўскладненні, якія і абмяжоўваюць працаздольнасць, і траўмуюць псіхіку, а ў некаторых выпадках прыводзяць да інваліднасці і нават лятальнага зыходу.

У апендыцыту ёсць характэрныя прыкметы. Боль у жываце ўзнікае паступова. Спачатку ён можа засяроджвацца ў верхніх аддзелах жывата або па ўсім жываце, а праз 8-10 гадзін змяшчаецца ў ніжні правы бок жывата. Павышаецца тэмпература цела. Могуць быць ваніты (адзін-два разы), нячасты вадкі стул. Вось на гэтым этапе хворы павінен звярнуцца па медыцынскую дапамогу.

Даволі часта хворыя перакананы, што ў іх не апендыцыт, а нейкае іншае захворванне. Боль уверсе жывата пажылыя людзі, напрыклад, часта ўспрымаюць як абвастрэнне гастрыту, халецыстыту або язвы страўніка. Павышаную тэмпературу, асабліва ў дзяцей, бацькі нярэдка звязваюць з прастудай. Жанчыны схільныя лічыць, што боль у жываце выкліканы запаленчым захворваннем яечнікаў і, каб зняць яго, прымяняюць праграванне, што недапушчальна!

Нярэдка хворыя імкнуцца прыняць абязбольвальны сродак, шукаюць спосаб неяк прытупіць боль. Аднак менавіта з-за прыёму анальгетыкаў пацыенты і спазняюцца са зваротам да ўрача. Пасля прыёму прэпарата чалавеку становіцца лягчэй, а тым часам працэс у хворым адростку прагрэсуе. У ім збіраецца гной, сценка апендыкса падвяргаецца некратычным (некроз — змярцвенне) змяненням, разбураецца, і гной выходзіць у брушную поласць. У гэты момант чалавек адчувае рэзкае ўзмацненне болю ў жываце. Стан рэзка пагаршаецца, і вось тады пацыент вырашае звярнуцца па меддапамогу.

Аднак спрыяльны для аперацыі час страчаны. Аператыўнае ўмяшанне праводзіцца ўжо на фоне цяжкага агульнага стану. Адсюль і больш працяглы пасляаперацыйны перыяд, патрабуецца большая колькасць дарагіх медыкаментаў.

Пры з'яўленні болю ў жываце неабходна ў самы кароткі тэрмін звярнуцца ў бліжэйшую медустанову — медпункт, фельчарска-акушэрскі пункт, паліклініку, прыёмны пакой любой бальніцы, выклікаць «хуткую дапамогу» ў начны час ці выхадны дзень. Дазвольце ўрачу своечасова паставіць дыягназ.

■ Сезонная праблема

# КЛЯШЧЫ ВЫЙШЛІ НА ПАЛЯВАННЕ

**Клешчавы сезон адкрыўся сёлета незвычайна рана. Па назіраннях энтамолагаў, у паўднёвых прыродных біятопах краіны з'явіліся першыя іксодавыя кляшчы. Першыя ўкусы зарэгістраваны яшчэ напрыканцы лютага ў Брэсцкай вобласці, а ў сакавіку — яшчэ і ў Віцебскай, Гродзенскай абласцях і Мінску. Іксодавы клешч можа быць пераносчыкам дзевяці інфекцыйных захворванняў, у тым ліку клешчавага энцэфаліту і лаймбарэліёзу.**



***Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя рэкамендуе:***

1. Пры наведванні дачы, лесу бярыце з сабой рэпеленты, ёд, ніткі, пінцэт, шкляны ці пластмасавы флакончык, які шчыльна закаркоўваецца, вату або ватныя палачкі.

2. Калі даводзіцца быць на тэрыторыі з высокімі кустамі, трэба апранацца так, каб клешч не трапіў пад адзенне. Галаву накрыць кепкай, а лепей — капелюшом, на нагах — боты. Адзенне апрацаваць спецыяльнымі рэчывамі, якія адпалохваюць (рэпеленты) або забіваюць (акарыцыды) кляшчоў.

3. Час ад часу трэба праводзіць самаагляд. Пасля вяртання з лесу вельмі дасканала агледзець цела і адзенне. Клешч прысмоктваецца не адразу, а таму можна паспець выявіць яго да гэтага моманту. Проста патрэсці адзенне недастаткова — трэба вельмі ўважліва агледзець і сябе, і ўсе прадметы, жывёл, якія былі з вамі.

4. Вясной і на пачатку лета не трэба несці дадому лясныя кветкі.

5. Казінае малако перад ужываннем трэба гатаваць 3-5 хвілін.

***Як выдаліць кляшча?***

❍ Пінцэтам асцярожна разгойдваюць і выцягваюць брушка кляшча.

❍ Пятлёй ніткі, накінутай на цела кляшча як мага бліжэй да хабатка, выкручваюць яго па стрэлцы гадзінніка.

❍ Месца ўкусу пасля выдалення апрацоўваюць 3-працэнтным перакісам вадароду, ёдам або любым спіртавым растворам. Кляшча варта захаваць у флаконе, які шчыльна закрываецца.

❍ Калі вас укусіў клешч, як мага хутчэй звярніцеся да ўчастковага тэрапеўта (педыятра), які пры неабходнасці адправіць кляшча на даследаванне, прызначыць прафілактычнае лячэнне.

***Абараніце жывёл***

Кляшчы для жывёл небяспечныя ў сэнсе магчымага заражэння піраплазмозам. А таму для жывёл пры наведванні лесу трэба прымяняць розныя спецыяльныя спрэі, аброжкі, кроплі. І абавязкова трэба аглядаць жывёлу па вяртанні дадому. Выдаляць кляшчоў з жывёлы зручней пінцэтам.

■ Парады для ўсіх

# ПРЫВІТАННЕ... ГІПАВІТАМІНОЗ!

**Дэфіцыт кожнага вітаміну мае свае сімптомы. Авітаміноз C праяўляецца цынгой — кровацечывасцю дзяснаў, выпадзеннем зубоў, моцным болем у суставах і слабасцю. Авітаміноз A — гэта «курыная слепата» (парушэнне зроку ў прыцемках). Дэфіцыт вітаміну $B_{12}$ — «заеды» (трэшчынкі ля губ). Авітаміноз — гэта рэзкае або поўнае расходаванне запасаў вітамінаў, такое сустракаецца не так часта. Усё ж такі цяпер мы круглы год ужываем агародніну, садавіну, ды і фармацэўтычная прамысловасць прапануе нам шырокі асартымент сінтэзаваных вітамінаў і вітамінных комплексаў. А вось гіпавітаміноз — вітамінная недастатковасць — з'ява частая.**

Праяўляецца такі стан прыкметамі, на якія мы амаль не звяртаем увагі. Стомленасць, зніжэнне працаздольнасці, пагаршэнне сну, памяці, перапады настрою. Як правіла, мы звязваем гэта са зменай сезонаў, хоць менавіта пералічанае вышэй і ёсць праява зімова-веснавога гіпавітамінозу. Калі не звярнуць на гэта ўвагі, дэфіцыт вітамінаў можа стаць больш сур'ёзным і заявіць аб сабе частымі прастуднымі захворваннямі, зменамі знешняга стану скуры (сухасць ці, наадварот, павышаная тлустасць), ломкасцю пазногцяў, выпадзеннем валасоў.

Усе натуральныя прадукты (як жывёльнага, так і расліннага паходжання) служаць для нас асноўнымі крыніцамі вітамінаў. Праўда, іх нельга лічыць паўнацэннымі «пастаўшчыкамі», паколькі сучасныя аграрныя тэхналогіі гэтаму перашкаджаюць. Таму найбольш разумным на сёння з'яўляецца дадатковы прыём харчовых дабавак.

У нашым арганізме штодня адбываюцца біяхімічныя працэсы, у якіх удзельнічаюць вітаміны. Таму большасць з іх нам патрэбны штодня. Выключэнне складаюць тлушчараствaральныя вітаміны: А, Д, Е, К, якія могуць назапашвацца і выводзяцца павольней, чым іншыя вітаміны. Але гэта здараецца, толькі калі пералічаныя вітаміны штодня паступаюць у арганізм у вялікай колькасці.

**ЦІ МОЖНА ВІТАМІНЫ ЎЖЫВАЦЬ УСІМ?**

У асноўным хранічныя захворванні, у тым ліку і анкалагічныя, не з'яўляюцца супрацьпаказаннем да прыёму полівітамінных прэпаратаў. У вітамінаў ёсць свае пабочныя эфекты, але праяўляюцца яны, толькі калі размова ідзе пра сур'ёзную передазіроўку. А алергічныя рэакцыі (высыпка, пачырваненне скуры) узнікаюць часцей нават не на самі вітаміны, а на спадарожныя кампаненты, якія ўваходзяць у састаў капсул ці таблетак. Часам бывае алергія на вітаміны групы B і вітамін C, прычым алергічная рэакцыя часцей развіваецца на вітаміны, атрыманыя сінтэтычным шляхам, і радзей — на вітаміны з прыроднай сыравіны. Алергія на вітаміны актыўна вывучаецца апошнім часам. Справа ў тым, што большасць людзей, якія рэагуюць на полівітамінныя прэпараты, спакойна пераносяць звычайныя харчовыя прадукты, якія змяшчаюць не менш вітамінаў, «небяспечных» для іх.

**ДЗЕЛЯ БАЛАНСУ**

Вітаміны рэгулююць абменныя працэсы нашага арганізма, але не заўсёды здольныя іх паскорыць ці запаволіць. Хоць існуе і прамая сувязь: вітаміны групы B паскараюць абмен рэчываў — тлушчаў, бялкоў, вугляводаў; вітамін C і біяфлаваноіды запавольваюць працэсы старэння скуры, робяць больш моцнымі сувязі паміж яе структурамі. Вітамін A паскарае працэсы аднаўлення слізістых абалонак, а вітамін Д — касцявой тканкі. І ўсё ж такі самая важная функцыя вітамінаў — падтрыманне балансу ў арганізме, што і дапамагае нам забяспечваць здароўе.

■ Сексуальнае здароўе

# ІГРАЙ, ГАРМОН!

**Асноўнымі ворагамі сексуальнасці, асабліва ў мужчын, з'яўляюцца лішняя вага, атэрасклероз, гіпертанія і цукровы дыябет**

**Паводле слоў урача-сексолага Мінскага гарадскога псіхіятрычнага дыспансера Мікалая ХВАШЧЫНСКАГА, лішняя вага цесна звязана з хваробамі сардэчна-сасудзістай сістэмы (атэрасклероз, інфаркт міякарда, інсульт, гіпертанія). Атлусценне таксама спрыяе цукроваму дыябету, хваробам печані і жоўцевых шляхоў, хваробам скуры (экзэма), рассеянаму склерозу, артрытам, астэахандрозу, падагры, а таксама сексуальным парушэнням. У мужчын павышаецца колькасць жаночых палавых гармонаў, узмацняецца вывядзенне з арганізма тэстастэрону, аслабляецца эрэкцыя і паскараецца эякуляцыя, у жанчын зніжаецца лібіда (сексуальнае жаданне) і парушаецца аргазм.**



Асноўная ўмова ўмацавання сексуальнага здароўя — паўнавартаснае харчаванне, ужыванне прадуктаў, якія аказваюць спецыфічнае ўздзеянне на арганізм (так званых афрадызіякаў).

**Паўнавартасная ежа — гэта:**

❍ бясшкоднасць і разнастайнасць

❍ больш расліннай ежы, чым жывёльнай

❍ збалансаванасць бялкоў, тлушчаў і вугляводаў

❍ дастатковая колькасць вітамінаў, макра- і мікраэлементаў

❍ неабходная колькасць вадкасці

❍ дастатковая колькасць баластных рэчываў (харчовых валокнаў)

❍ адпаведнасць каларыйнасці энергазатратам

❍ мінімум рафінаваных прадуктаў (белага цукру, мукі вышэйшага гатунку)

❍ мінімум солі, жывёльнага тлушчу

❍ максімум свежых натурпрадуктаў (цэльнае зерне, бабы, насенне, арэхі, садавіна, агародніна).

## Тлушчы (ліпіды)

Крыніца энергіі, вітамінаў А, Д, Е, неабходных для сексуальнай актыўнасці.

Найбольш карысныя ў гэтым сэнсе алеі сланечнікавы і кукурузны, насенне кунжуту, соевыя бабы, арэхі, асабліва грэцкія. Найменш багатае на жывёльныя тлушчы мяса труса і птушак.

Атэрасклероз выклікаецца лішкам у харчаванні насычаных тлушчаў і недахопам поліненасычаных. Адзін з ліпідаў плазмы крыві — халестэрын, «папярэднік» мужчынскіх і жаночых палавых гармонаў. Яго лішак прыводзіць да ўтварэння атэрасклератычных бляшак у сасудах. Паступае халестэрын у арганізм з прадуктамі жывёльнага паходжання (асабліва багатыя ў гэтым сэнсе яйкі, печань, малочны тлушч), аднак увесь неабходны халестэрын сінтэзуецца ў печані.

## Бялкі (пратэіны)

Будуюць і аднаўляюць клеткі і тканкі, сінтэзуюць ферменты і гармоны. Складаюцца з амінакіслот (заменных, якія сінтэзуюцца ў арганізме, і незаменных, якія павінны паступаць з ежай).

Паўнацэнныя бялкі (змяшчаюць усе незаменныя амінакіслоты) — гэта яечны бялок, печань, неразведзенае малако, малочныя прадукты (акрамя вяршкоў, смятаны і масла), рыба, мяса птушак, ялавічына, свініна, грыбы, хлеб цэльназерневы, апельсіны, фасоля, гарох, зяленіва, арэхі, соя, насенне сланечніку, брусельская капуста, морква.

Непаўнацэнныя бялкі — бабовыя (акрамя соі), кукуруза, жэлацін.

Недахоп бялку можа прывесці да прыгнечання ахоўных сіл арганізма, зніжэння лібіда, аслаблення эрэкцыі ў мужчын.

## Вугляводы

Неабходны для рэгуляцыі абмену бялкоў і тлушчаў, нармальнага функцыянавання нервовай сістэмы. Асноўная крыніца — агародніна і садавіна.

Найбольш карысныя — нерафінаваныя складаныя, якія змяшчаюць вітаміны, мінералы, харчовыя валокны (агародніна, бабовыя, арэхі, насенне, цэльнае зерне, карычневы цукар).

Ужыванне звыш 6 кг цукру за год лічыцца таксічным. Натуральнымі заменнікамі цукру з'яўляюцца мёд, сухафрукты, у тым ліку інжыр, курага, разынкі, фінікі.

## Баластныя рэчывы (харчовыя валокны)

Патрэбны для выдалення з арганізма таксінаў, цяжкіх металаў, зніжэння ўзроўню халестэрыну, запавольвання ўсмоктвання цукру, папярэджвання атлусцення, гіпертаніі, ішэміі. Найбольшая колькасць — у аўсяным і пшанічным вотруб'і, садавіне, чырвоных лупінах арахісу, муцэ нізкіх гатункаў.

Карысна 1-2 разы на дзень дадаваць па 50 г вотруб'я ў суп, кефір, малако, сок.

## Вітаміны

Патрэба ў вітамінах узрастае пры павышанай сексуальнай актыўнасці, з узростам, пры фізічных і псіхаэмацыянальных нагрузках, захворваннях і траўмах.

***Вітамін Е*** (рэгулюе рэпрадуктыўную і сексуальную функцыю — сперматагенез, лібіда, патэнцыю, валодае антыканцэрагенным дзеяннем, змяншае наступствы стрэсу, курэння, ужывання алкаголю, запавольвае працэсы старэння).

Зерне пшаніцы, вотруб'е, арэхі, соя, прарошчаная пшаніца, насенне сланечніку, алей, жытні хлеб, нешліфаваны рыс, морква, гарох, бананы, шпінат, памідоры, абляпіха, грэцкія крупы, яйкі, ласось.

***Вітамін А*** (удзельнічае ва ўтварэнні спермы, сінтэзе палавых гармонаў у мужчын і жанчын, валодае антыканцэрагенным дзеяннем, аслабляе таксічны ўплыў навакольнага асяроддзя, тытуню і алкаголю, наступствы стрэсу, павышае супраціўляльнасць арганізма).

Морква, гарбуз, дыня, персік, кукуруза, кабачкі, печань ялавічная і курыная, чылійскі перац, капуста, курага і чарнасліў, пятрушка, зялёная цыбуля, буракі, чырвоны салодкі перац, гарох, зялёная фасоля, ягады, яйкі, кавун.

***Вітамін С*** (рэгулюе сінтэз палавых гармонаў і ўзровень халестэрыну, валодае антыканцэрагенным, антытаксічным дзеяннем, павышае ахоўныя сілы арганізма, змяншае шкоднае ўздзеянне алкаголю і тытуню). Дэфіцыт прыводзіць да зніжэння лібіда.

Салодкі перац, капуста, пятрушка, зялёная цыбуля, мандарыны, шпінат, хурма, суніцы, маліны, лімоны, апельсіны, грэйпфруты, радыска, памідоры.

Добра спалучаецца з вітамінамі А і Е. Рэкамендуецца штодня 500-1000 мг вітаміну С +200-400 МЕ вітаміну Е+ 5-10 тыс. МЕ вітаміну А.

***Вітаміны групы В*** ($B_1$, $B_2$, $B_3$, $B_4$, PP, $B_6$, $B_{12}$, фоліевая кіслата) — стымулююць сінтэз тэстастэрону, спрыяюць выспяванню спермы.

Піўныя дрожджы, печань, арэхі, рыба, сыр, яйкі, грэцкія крупы, кукуруза, цэльназерневы хлеб, малако, аўсяныя шматкі, гарох, сухафрукты, агародніна і садавіна, жытні хлеб.

## Мінеральныя рэчывы

***Цынк.*** Удзельнічае ў сінтэзе тэстастэрону, павышае актыўнасць палавых гармонаў і сперматагенезу, тармозіць развіццё адэномы прастаты, узмацняе лібіда і патэнцыю.

Вустрыцы, вотруб'е, грыбы, насенне гарбуза і сланечніку, рыба, арэхі, цыбуля, гарох, прарошчаная пшаніца, вінаградны сок, авёс, жыта, яйкі, печань. З узростам засваяльнасць цынку змяншаецца. Курэнне, алкаголь, кава, хранічныя стрэсы пагаршаюць засваенне цынку і паскараюць яго вывядзенне.

***Селен***. Паляпшае выпрацоўку і якасць спермы, павышае лібіда, узмацняе патэнцыю, павышае імунітэт, зніжае рызыку раку прастаты.

Каменная і марская соль, цэльнае зерне, пшанічнае вотруб'е, часнок, кукуруза, піўныя дрожджы, грыбы, морапрадукты, яйкі. Кансерваваная садавіна і гародніна амаль не змяшчаюць селен. Цукар перашкаджае засваенню селену.

***Паваранaя соль.*** Каменная соль змяшчае не толькі NaCl, але і ёд, магній, селен, цынк, жалеза, кальцый, калій. Лішак солі вядзе да гіпертаніі і атэрасклерозу, што парушае кровазабеспячэнне палавых органаў і выклікае аслабленне эрэкцыі.

Багатыя на соль: марскія водарасці, аліўкі зялёныя і спелыя, сушанае мяса і рыба, вяндліна, канцэнтраты булёнаў і супоў, смажаная бульба, квашаная капуста.

Сутачная патрэба ў солі, паводле даследаванняў, у 2-5 разоў меншая, чым звычайна спажываецца.

**Прадукты здаровага харчавання:**

зялёны чай, свежыя садавіна і гародніна — 500-600 г на дзень; сухафрукты, мёд (3-4 ч.л. у дзень); вотруб'е (аўсянае, пшанічнае, жытняе) — 5-6 ст.л. дадаваць у ежу; алей, вегетарыянскія супы, арэхі, часнок, цыбуля, зяленіва, асабліва сельдэрэй, нятлусты тварог — 150-200 г у дзень; кісламалочная сыроватка, рыба — 3-4 разы на тыдні; перапяліныя яйкі — да 4-5 за дзень, абястлушчанае малако і кісламалочныя прадукты, нясмажанае насенне сланечніку і гарбуза, нятлустае мяса — 1-2 разы на тыдні; гарбуз, зерневы хлеб, аўсяная і грэцкая каша, тапінамбур, марская капуста, шакалад (звыш 70% какавы) — 25-30 г за дзень.

**Найлепшыя камбінацыі прадуктаў для павышэння сексуальнасці:**

❍ насенне кунжуту з соя́й, з агароднінай і зернем

❍ бабы з насеннем гарбуза або з малаком

❍ салат з гароху з соусам з насення кунжуту

❍ ёгурт і фасоля з арэхамі

❍ рыс з фасоляй або насеннем кунжуту

❍ паста з фасолі з арэхамі

❍ вараная фасоля з жытнім хлебам

❍ зерне, арэхі, бабы або насенне з малочнымі прадуктамі, куранятамі, рыбай.

## Пры лішняй вазе

▶ Абмяжуйце павараную соль, кашы, макарону, кандытарскія вырабы

▶ Замест белага цукру — мёд і сухафрукты

▶ Штодня — да 1 кг свежай сырой агародніны і садавіны (акрамя вінаграду і бананаў), каля 50 г пшанічнага вотруб'я.

▶ Замест ялавічыны, свініны, бараніны, каўбас — мяса куранят без скуры, вараная рыба.

▶ Замест цэльнага малака — абястлушчанае і ёгурт.

▶ Замест цвёрдага і плаўленага сыру — абястлушчаны тварог.

▶ Замест жывёльных тлушчаў — алеі.

▶ Замест белага хлеба — хлеб з цэльнага зерня.

▶ Харчаванне дробнае (не радзей за 5 разоў на суткі).

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Народныя таленты

# ЛЫЖКА, ЯКУЮ ЦЯЖКА АБЛІЗАЦЬ

**У Бярэзінскім раёне працуе адзіны на Міншчыне музей драўлянай лыжкі. З'явіўся ён у райцэнтры невыпадкова. Менавіта тут працуюць адмысловыя лыжкары, якія не страцілі майстэрства сваіх продкаў.**


Яўген ОСІПАЎ трымае лыжку з гербам горада Беразіно.

Драўляная лыжка сапраўды вартая ўвагі. Менавіта яна карміла многія пакаленні беларусаў і ў прамым, і ў пераносным сэнсе. У галодныя неўраджайныя гады сяляне выраблялі лыжкі на продаж. Узамен куплялі муку, соль, крупы. Так і выжывалі.

— А пачынаецца працэс вырабу лыжкі са звычайнага палена, якому майстар надае пэўную форму з дапамогай выдзёўбвання спецыяльнымі інструментамі. Прычым яно павінна быць суцэльным, — тлумачыць кіраўнік народнага клуба майстроў Бярэзінскага раёна Тамара Тарасенка. — Лепш за ўсё падыходзіць драўніна ліпы, паколькі яна самая мяккая. Але Яўген Осіпаў з вёскі Лагі вырабіў спецыяльна для музея 14 лыжак з розных парод дрэў. У тым ліку з яблыні, грушы, клёну, елкі, бярозы, вольхі, дубу. І кожны выраб аздобіў уласцівымі гэтым дрэвам кветкамі і галінкамі.

У Яўгена Паўлавіча што ні работа, то шэдэўр. Напрыклад, ён стварыў лыжку для таўстуноў. Не, не для таго, каб больш ежы ёй чэрпалі. Наадварот, каб худзелі. І называецца яна «Вожык-альбінос». Толькі на адны іголкі пайшло 1200 зубачыстак. Такую лыжку, нават калі і не наеўся, не абліжаш. Або, напрыклад, лыжка, якую майстар назваў так: «Мішка вельмі-вельмі любіць мёд». Да дупла крадзецца мядзведзь, каб паласавацца салодкім, але яго не пускаюць пчолы, што ўюцца вакол. Яўген Осіпаў любіць адлюстроўваць у сваіх творах жыццёвыя гісторыі. Напрыклад, на адной з лыжак захапляе сюжэт гульні ў карты бабы з дзедам. У калекцыі музея і трыпціх творцы: дзве лыжкі ў выглядзе сэрца, звязаныя ланцужком, сімвалізуюць вечнае пачуццё — каханне.

У музеі захоўваецца і яшчэ адна работа Яўгена Паўлавіча — лыжка з гербам горада Беразіно аж на 12 літраў! Менавіта яму належала ідэя ўстанавіць помнік лыжцы. Яе памер — 2 метры 40 сантыметраў. Змайстравалі скульптуру ўчатырох: Яўген Паўлавіч з сынам, а таксама разьбяры Васіль Мурашка і Аляксандр Паскробка. Дарэчы, сюды пакланіцца лыжцы-карміліцы прыязджаюць пасля ЗАГСа маладажоны. Гэта ўжо стала добрай традыцыяй.

Васіль Андрэевіч пачаў вырабляць лыжкі адносна нядаўна. Але яны маюць сваю адметнасць: роўныя, гладкія, нібы выпраменьваюць нейкую цеплыню і святло. Аляксандр Віктаравіч часта аздабляе свае лыжкі выявай бусла — сімвала Беларусі і сямейнага шчасця. У задумах бярэзінскіх лыжачнікаў — зрабіць самую вялікую лыжку ў свеце. У Кнігу рэкордаў Гінэса занесена пакуль толькі адна драўляная лыжка, вырабленая ў Расіі. Яе памер — звыш 9 метраў.

У 2010 годзе ў раёне прайшло першае абласное свята разьбяроў-лыжачнікаў. Пераможцы конкурсу пакінулі для музея свае лыжкі, якія тут і захоўваюцца. Цяпер у экспазіцыі налічваецца звыш 200 экспанатаў. Прычым калекцыя пастаянна папаўняецца. Самая старая лыжка была знойдзена на сметніку. Відавочна, што ёй карысталіся доўгі час: пачарнелая, вышчарбленая. Ёсць і лыжкі, размаляваныя фарбай, аздобленыя рознымі матэрыяламі: саломкай, бісерам.

Роспіс лыжак характэрны для нашых суседзяў — расіян. У Беларусі ён не выкарыстоўваўся. Але ў музеі вырашылі, што такія работы толькі ўпрыгожаць экспазіцыю.

Яшчэ нядаўна музей знаходзіўся ў прыватным доме Ганны Ждановіч. Сёлета пераехаў у раённы цэнтр рамёстваў, для якога перадалі будынак былога дзіцячага садка.

— Наш раён багаты майстрамі розных кірункаў народнай творчасці. Раней яны былі разрозненыя, стваралі дома, самі па сабе. Мы ўсіх аб'ядналі пад дахам цэнтра, — адзначае Тамара Аляксандраўна. — Тут яны ладзяць персанальныя выставы, майстар-класы для ўсіх ахвотных, дзеляцца вопытам.

Нядаўна ў адным з пакояў адкрылася персанальная выстава традыцыйных беларускіх лялек Ганны Ждановіч. Ганна Аляксандраўна, дарэчы, шмат зрабіла для таго, каб адрадзіць у раёне майстэрства вырабу драўлянай лыжкі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ Не — наркотыкам!

Мікалай КАРПЯНКОЎ:

## «ВЫПАДКІ СМЕРЦІ АД НАРКОТЫКАЎ МЫ РАСЦЭНЬВАЕМ ЯК

# ТЭРАКТ СУПРАЦЬ МОЛАДЗІ»

**Небывалы рост колькасці і разнастайнасці новых псіхаактыўных рэчываў, рост злоўжывання імі — новая праблема Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Некаторыя звесткі ўказваюць на наяўнасць у Еўропе магутнасцяў па іх вырабе, паведамляецца ў дакладзе Міжнароднага камітэта па кантролі над наркотыкамі за мінулы год.**

— Мы будзем шырока паведамляць пра кожны выпадак гібелі няпоўнагадовых праз перадазіроўку, — кажа **начальнік упраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Мікалай КАРПЯНКОЎ.** — Выпадкі смерці ад наркотыкаў мы расцэньваем як тэракт супраць нашай моладзі.

Па ацэначных звестках, у краіне сёння каля 130-150 тысяч нарказалежных, з якіх каля 100 тысяч ужываюць опій, выраблены з насення маку. У апійнай наркаманіі свая спецыфіка. Ін'екцыйнае ўвядзенне наркотыку звязана з высокай рызыкай перадачы сацыяльна небяспечных інфекцый. Акрамя таго, яна звязана з арганізацыяй прытонаў, «варачных адрасоў», па якіх гатуюцца наркотыкі. А гэта выклікае незадаволенасць усіх, каму выпала суседнічаць з падобнымі кватэрамі. Актыўная работа праваахоўнікаў толькі ў апошнія некалькі месяцаў прывяла да таго, што колькасць тых, хто спажывае опій, пачала зніжацца. А разам з гэтым амаль сышлі на нуль скаргі насельніцтва на «варачныя адрасы». Цяпер ахоўнікі правапарадку актыўна процідзейнічаюць распаўсюджванню курыльных сумесяў.

— Мы ўжо сёння аператыўным шляхам забараняем новыя наркарэчывы, якія з'яўляюцца, — тлумачыць спадар Карпянкоў. — Аднак такая работа будзе ўзмоцнена. Гэтай вясной будзе створана антынаркатычная камісія з ліку спецыялістаў Дзяржкамітэта службовых экспертыз, міністэрстваў унутраных спраў і аховы здароўя. Камісія на працягу сутак будзе прызнаваць новае рэчыва забароненым, зыходзячы з факта яго небяспекі для здароўя. Такія рэчывы будуць залічвацца да аналагаў. І ўжо на другі дзень за распаўсюджванне ўчора яшчэ незнаёмага рэчыва надыдзе крымінальная адказнасць. Падобны захад зробіць нявыгадным у нас наркагандаль.

Плануецца таксама ў найбліжэйшы час увесці больш жорсткую крымінальную адказнасць (зняволенне тэрмінам ад 8 да 12 гадоў) за незаконнае абарачэнне наркатычных рэчываў, кантрабанду, за іх выраб у лабараторных умовах, за збыт няпоўнагадовымі.

Маніторынг інтэрнэт-прасторы працягваецца, і гэта дазваляе выявіць вялікіх, сістэмных нарказбытчыкаў. Шэраг арганізаваных груп ужо спынілі сваю дзейнасць.

**Галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Іван КАНАРАЗАЎ** нагадвае, што ў краіне цалкам даступная амбулаторная і стацыянарная дапамога — на агульных падставах і ананімная. Ананімная дапамога магчымая на любым этапе. На базе рэабілітацыйнага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя рэабілітацыя прапануецца цягам 28 дзён. Акрамя таго, на платнай аснове рэабілітацыйныя паслугі прапануюць іншыя цэнтры, дзейнасць якіх грунтуецца на сваіх праграмах вяртання да «цвярозага» жыцця.




Да 80 працэнтаў нарказалежных, якія трапляюць на ўлік наркадыспансераў, — гэта тыя, пра якіх стала вядома дзякуючы інфармацыі ад работнікаў праваахоўных органаў. І толькі 20 працэнтаў звяртаюцца па дапамогу самі, што тлумачыцца як адмаўленнем захворвання, так і крымінальным падмуркам праблемы. У Беларусі дзейнічае 18 пунктаў замяшчальнай метадонавай тэрапіі, дзе праходзяць лячэнне каля 1100 пацыентаў.

Што да курыльных сумесяў, то іх ужыванне, як адзначае спадар Канаразаў, пагражае больш працяглым часам шпіталізацыі такіх хворых, значным зніжэннем якасці здароўя — як фізічнага, так і інтэлектуальнага, — а таксама непрадказальнымі фактамі гібелі ў выпадку перадазіроўкі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**


**Свята для ўсіх!**
Віншуем **Пятра Міхайлавіча ЛІША,** старэйшага кіраўніка сельгаспрадпрыемства нашага раёна, з днём нараджэння і першай баразной. Яркага вясновага сонца вам, працалюбства і даўгалецця.
**Адміністрацыя і прафкам ААТ «Радзіма» Пружанскага раёна.**
*УНП 200026602*


**Сонечных світанняў над Ясельдай!**
Ад шчырага сэрца **віншуем нашых цудоўных працаўніц з прыходам вясны.** Жадаю толькі сонечных світанняў над Ясельдай, бадзёрага вясновага настрою, самых прыгожых кветак ды незабыўных усмешак ад любімых мужчын, моцнага сямейнага шчасця, здаровых немаўлятак, як зярнятак, спакойнага ды шчодрага даўгалецця.
**З павагай, Мікалай Міронавіч ШЫКАЛАЙ, дырэктар філіяла Іванаўскага райпа Каапрам.**
*УНП 200193790*

# «ГЛЯНЬ, ВЯСНА НАСТАЛА!»

## БЕЛАРУСКІЯ ПАЭТЫ — ДЗЕЦЯМ




**Па гарызанталі: 1.** «Зайца ўбачыла ...\\І застракатала:\\«Пераапранайся, белы.\\Глянь, вясна настала!». З верша В. Савасцюка «Зайцава бяда». **5.** Дзе крыляе ...-цецяроўнік,\\Там не дрэмле вушлы цецярук». З верша В. Гардзея «...-цецяроўнік». **7.** «Галінка-вярбінка», -\\Прасіў ...,\\Мо пакалыхала б\\Маіх ты дзяцей?». З верша М. Танка «Галінка і верабей». **10.** Той, хто выраблае тканіну. **11.** «Каб ... высокае\\Свяціла на палі,\\А кветкі сінявокія\\Зноў на лугах цвілі». З верша М. Танка «Ірынка». **12.** У некаторых замежных краінах — загарадны дом. **15.** «З вярбы пупышкі паляцелі.\\Заслала свой ... трава». З верша А. Астрэйкі «Калгасны сад». **16.** ...-вясніца — пралесак царыца (прык.). 19. Прыгожае велічнае дрэва; у вуснапаэтычнай творчасці — гэта хлопец, ператвораны ў дрэва праз праклён маці. **20.** Прадукт, прыгатаваны для пiцця. **24.** «І ліецца хваляй песня -\\ Ціхі, ясны ... вясне». З верша М. Багдановіча «Па-над белым пухам вішняў...». **25.** «Плача ...,\\Плача ... .\\Цякуць па сарочцы\\бярозавай слёзкі». З верша І. Муравейкі «Плача ...». **26.** Паглыбленне, дзірачка. **27.** «Мядзведзь на пасецы — бяда.\\Трашчаць вуллі і рой гудзе.\\ Была б у Мішкі ...,\\То цёк бы мёд па барадзе». З верша В. Гардзея «Мядзведзь на пасецы».

**Па вертыкалі: 1.** «Бо сягоння вербніца -\\... ў вярбы». З верша У. Мазго «Вербніца». **2.** «За хатай поле пачыналась,\\Дзе жыта хараша гайдалась,\\І рос ..., ячмень і грэчка». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля». **3.** ... за рэдзьку не саладзейшы (прык.). **4.** Замінка ў руху каня. **5.** З твару ..., а ў сярэдзіне баўтун (прык.). **6.** «І сам ...-паляўнічы\\Вас у госці тут закліча,\\Жабу ў дзюбе несучы». З вершаванай казкі Я. Коласа «Рак-вусач». **8.** «Бегла мышка па дарожцы,\\... несла кошцы». З верша Л. Дранько-Майсюка «Разумная кошка». **9.** «Купіў слонік ...,\\Скача з ім, нібыта конік». З верша А. Старынчыка «Слон і парасон». **13.** «Краска мілая мая,\\... веснавая!». З верша Я. Коласа «Краска». **14.** «З сяўнёю ... пахаджае,\\На скібіны валіцца зерне». З верша Я. Купалы «З песень аб вясне». **17.** «Маці — ... радзіла іх\\Ад першых пацалункаў сонца». З верша У. Жылкі «Пралескі». **18.** Харошая ... — лепшы сябра (прык.). **20.** «..., ..., небасхіл,\\Хустка васільковая!\\Пакацілася клубком\\Сонейка вясновае». З верша Л. Полазавай «Вясна». **21.** «Маладая вясна,\\Залатая ...!\\Будзь красна і ясна,\\Не шкадуй нам дабра!». З верша Я. Коласа «Песня аб вясне». **22.** Тое, што і тэзіс. **23.** Род марскога рака.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.**

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Сарока. 5. Ястраб. 7. Верабей. 10. Ткач. 11. Сонейка. 12. Шале. 15. Абрус. 16. Васна. 19. Явар. 20. Напітак. 24. Гімн. 25. Бярозка. 26. Ячэйка. 27. Барада.

**Па вертыкалі:** 1. Свята. 2. Авёс. 3. Хрэн. 4. Збой. 5. Яйка. 6. Бусел. 8. Падарунак. 9. Парасонік. 13. Госця. 14. Сявец. 17. Зямля. 18. Кніга. 20. Неба. 21. Пара. 22. Тэза. 23. Краб.

Даты | Падзеі | Людзі



**1868** год — нарадзіўся (вёска Студзянец, цяпер Касцюковіцкі раён) Панцеляймон Мікалаевіч Лепяшынскі, дзеяч рэвалюцыйнага руху, публіцыст, пісьменнік, педагог, доктар гістарычных навук. У 1895-м арыштаваны за рэвалюцыйную дзейнасць, сасланы на 3 гады ў Енісейскую губерню. З 1903-га — бальшавік, супрацоўнічаў у партыйных газетах. У 1907-1909 гадах выкладаў матэматыку ў Аршанскім рэальным вучылішчы. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года — на педагагічнай, навуковай і журналісцкай працы ў Петраградзе і Маскве. У 1918 годзе заснаваў доследна-паказальную працоўную школу-камуну ў вёсцы Літвінавічы Кармянскага раёна. У 1921-1924 гг. — адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Камісіі па распрацоўцы гісторыі РКП(б) (Гістпарта), выкладаў у Маскоўскім універсітэце і Камуністычнай акадэміі. Адзін з ініцыятараў стварэння і першы старшыня ЦК МОПР. З 1927 года — дырэктар Гістарычнага музея, затым — Музея рэвалюцыі ў Маскве. Аўтар навуковых прац, успамінаў, мастацкіх твораў. Памёр у 1944 годзе.

**1923** год — упершыню было прадэманстравана гукавое кіно. У ранні перыяд існавання кінематографа ў многіх краінах свету працавалі над стварэннем гукавога кіно. Пры гэтым спецыялісты сутыкнуліся з дзвюма галоўнымі праблемамі: цяжкасцю ў сінхранізацыі выявы і гуку і з недастатковай гучнасцю апошняга. Яшчэ ў канцы XIX стагоддзя Томас Эдысан спрабаваў вынайсці прыбор, які адначасова прайграваў бы гук і малюнак. Але яму гэта не ўдалося. У 1920 годзе амерыканскі вынаходнік Лі дэ Форэст узяўся за стварэнне гукавога кіно, якое назваў «фонафільмам». Ён вынайшаў практычны метад фатаграфавання гукавой хвалі на адной плёнцы з малюнкам. А 12 сакавіка 1923 года адкрыццё вучонага было прадэманстравана шырокай грамадскасці.

**1924** год — нарадзіўся (в. Рухча-2, цяпер Столінскі раён) Вячаслаў Лявонцьевіч Вярэніч, беларускі мовазнавец, кандыдат філалагічных навук (1975), замежны член Польскай акадэміі навук і мастацтваў у Кракаве (1992). Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага (1956). Даследаваў гаворкі польскіх перасяленцаў на тэрыторыі былога СССР і рэпатрыянтаў у Польшчы, беларускія народныя гаворкі, прозвішчы, імёны, мянушкі людзей і інш. Памёр 27 жніўня 1999 года.

Было сказана

**Рыгор БАРАДУЛІН, народны паэт Беларусі:**
*«Аголены меч не мае часу на роздум».*

**НАРОДЖАНЫЯ 11 сакавіка**

**Яны заўсёды ідуць крок у крок з часам, ведаюць, што такое рабіць кар'еру ў свеце, дзе перамагаюць моцныя. Яны ўсведамляюць, што калі затрымацца, то іншыя абгоняць, а перспектыва бачыць чужыя спіны не захапляе гэтых людзей. А расштурхоўваць навакольных — не ў іх правілах: яны перакананыя, што прыйдзе час — іх убачаць і ацэняць. Інтуіцыя дапамагае ім зразумець, што добра і карысна, нават калі для іншых гэта падробка і бясцэнак. Яны вылучаюцца патрабавальнасцю і самакантролем, але ў асабістым жыцці дазваляюць сабе расслабіцца (аднак пры адной умове — не быць пры гэтым смешнымі).**

**НАРОДЖАНЫЯ 12 сакавіка**

**Смелыя, рашучыя асобы, яны стойка процістаяць няўдачам, умела выкарыстоўваючы назапашаны вопыт. Яны дакладна бачаць мэту, але імкненне атрымаць усебаковае развіццё нярэдка адводзіць іх ад галоўнага шляху. Яны павінны абмяжоўваць сябе адной сферай, каб не выглядаць бестурботнымі стракозамі. Не баяцца рызыкоўных мерапрыемстваў, таму што вераць, што поспех прыходзіць да тых, хто ідзе да яго па лязе нажа. Ім прыемна быць прадметам размоў, яны разумныя і рэлігійныя, ведаюць, што ўсё праходзіць. Яны схільныя да эмацыянальнай нераўнавагі, ім неабходна знайсці баланс паміж «жадаю» і «магу» для таго, каб дабіцца поспеху і пазбегнуць рэзкіх скачкоў ад думкі да дзеяння.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 7.32 | 19.08 | 11.36 |
| Віцебск | — 7.23 | 18.56 | 11.33 |
| Магілёў | — 7.23 | 18.58 | 11.35 |
| Гомель | — 7.18 | 18.55 | 11.37 |
| Гродна | — 7.37 | 19.23 | 11.46 |
| Брэст | — 7.47 | 19.24 | 11.37 |

**Месяц**
*Поўня 16 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

**Імяніны**
*Пр.* Макара, Міхаіла, Сцяпана, Цімафея.
*К.* Юстыны, Бярнарда, Васіля, Максіміляна, Рыгора.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




...у суседзяў

| | |
|---|---|
| ВАРШАВА | +9..+11°С |
| ВІЛЬНЮС | +7..+9°С |
| КІЕЎ | +9..+11°С |
| МАСКВА | +8..+10°С |
| РЫГА | +8..+10°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +4..+6°С |

## УСМІХНЕМСЯ

**Доктар Айбаліт купіў сабе «Айфон».**
**Ай, малайчына!**

Жаночыя святы:
— 8 Сакавіка;
— дзень нараджэння сяброўкі (таму што тая на 3 гады старэйшая);
— дзень, калі зламаліся вагі;
— антэна не ловіць канал «Еўраспорт».

**Толькі калі Мікалай Пятровіч кінуў піць, ён упершыню ў жыцці зразумеў, што не так ужо і выдатна спявае і танцуе.**

Што там зялёны чай або зялёная кава для пахудзення! З'ешце зялёную каўбасу — і за дзень-другі страціце кілаграмаў пяць-сем.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 22.315. Індэкс 63850. Зак. № 1115.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 сакавіка 2014 года.